16+

ЛіМ

# Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 8 (5318) 28 лютага 2025 г.

ISSN 0024-4686




*Каб не было вайны*
*стар. 6*



*Скрупулёзная фіксацыя назіранняў*
*стар. 12*



*Нацыянальны песенны стыль*
*стар. 15*

# Пад аховай Ефрасінні



*Кадр з фільма «Прыстанак святой Ефрасінні».*

Маладая манашка склікае ўсіх на малітву — так калісьці Ной збіраў на каўчэг жывёл, каб ўратаваць ад гібелі падчас патопу. Божы храм — як той каўчэг, а малітва — паратунак ад гібелі душы. Гібель і смерць — у дадзеным кантэксце не сінонімы, бо душу можна загубіць, не ўратаваўшы праз пакаянне, але яна бессмяротная. Менавіта пра бессмяротнасць хочацца разважаць пасля прагляду дакументальнага фільма «Прыстанак святой Ефрасінні», прэм’ерныя паказы якога адбываюцца па ўсёй краіне.

І гэта бессмяротнасць, якую мы можам асэнсаваць самі. Напрыклад, наведаўшы Полацк, горад святой Ефрасінні, дзе яна цяпер спачывае ў манастыры, які сама ж і заснавала. Альбо паглядзеўшы стужку, якая раскрывае дзіўны прыклад бессмяротнасці нашай Ефрасінні: пакінуўшы гэты свет падчас паломніцтва на Святую зямлю, яна духоўна прысутнічала ў прасторы сваёй радзімы. Пра яе памяталі, распавядалі і звярталіся з малітвамі. І яна сапраўды нібыта пачула, бо лёс яе нятленных мошчаў хоць і быў вельмі драматычны — іх неаднойчы пераносілі ў розныя мясціны, ратавалі і нават спрабавалі зганьбіць, — але прападобная, якая была праслаўлена царквой, усё адно вярнулася ў свой Полацк. А яе імя цяпер — сімвал чысціні і шчырай веры, якая творыць цуды. Адным з іх можна лічыць заснаваны беларускай апякункай Спаса-Ефрасіннеўскі жаночы манастыр, які таксама здолеў перажыць ліхалецці і выпрабаванні і адрадзіцца да жыцця.

**Працяг на стар. 4 ▸**

# Стварэнне рэлігійных цэнтраў і святкаванне значных дат

**Сёлета Беларуская праваслаўная царква святкуе значныя для ўсяго праваслаўнага свету даты. У маі адбудуцца ўрачыстыя мерапрыемствы з нагоды 555-годдзя здабыцця цудатворнага Жыровіцкага абраза Божай Маці і 505-годдзя Свята-Успенскага Жыровіцкага стаўрапігіяльнага мужчынскага манастыра. У чэрвені будзе адзначацца яшчэ адна знакавая для праваслаўя дата — 900-годдзе з дня заснавання Спаса-Ефрасіннеўскага стаўрапігіяльнага жаночага манастыра ў Полацку. На гэтыя важныя для хрысціян падзеі звернута ўвага і кіраўніка дзяржавы.**



На пачатку размовы з Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі Аляксандр Лукашэнка адзначыў: вельмі добра, што сустрэча з Уладыкам адбываецца пасля агульнага пасяджэння з прадстаўнікамі рэлігійных канфесій, якое адбылося 10 лютага. «Мне важна ведаць ваша меркаванне ў гэтым плане, — заўважыў кіраўнік дзяржавы. — Асабліва ў плане стварэння пэўных цэнтраў нашых рэлігій. Я ведаю, што наша праваслаўная царква заўсёды руплівa да ўсяго ставілася, але і яны (прадстаўнікі іншых канфесій. — В. К.) таксама руплівa ставяцца да ўсяго. Таму ваша меркаванне для мяне тут вельмі важнае».

Другое пытанне, на якім Прэзідэнт засяродзіў увагу Мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага, — добраўпарадкаванне Жыровічаў, што асабліва актуальна напярэдадні знакавых дат.

«Мы з Вамі па вясне, калі прырода ўжо будзе расцвітаць, пабываем у Жыровічах, паглядзім, што там трэба яшчэ зрабіць, каб гэта было дастойна, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Паколькі, як ні круці, праваслаўная царква — 80 з лішнім працэнтаў вернікаў сярод нашага насельніцтва, гэта асноўная рэлігія, канфесія, і дастойна павінна быць у Жыровічах. Каб паглядзелі і іншыя, як трэба рабіць і што мы хочам зрабіць».

Прэзідэнт прапанаваў абмеркаваць і іншыя пытанні праваслаўя. «Можа, да ўлад ёсць якія-небудзь пытанні — я гатовы іх абмеркаваць», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін праінфармаваў кіраўніка дзяржавы, чым сёння жыве і як развіваецца Беларуская праваслаўная царква, распавёў аб найбліжэйшых планах. «Недзе, можа, хацелася заручыцца Вашай падтрымкай, пачуць Вашу думку, — паведаміў Патрыяршы Экзарх. — І перш за ўсё хацелася б падзякаваць за тое, што Вы так клапоціцеся пра духоўныя цэнтры. У нас і Жыровічы, і Полацк — два такія цэнтры, якія прыцягваюць увагу ўсяго свету, не толькі беларусаў».

Уладыка расказаў, што летась завяршылася рэстаўрацыя і рэканструкцыя Жыровіцкага Свята-Успенскага манастырскага комплексу, а ў Полацку ў пачатку года адкрывалі пасля рэстаўрацыі старажытны храм, які ствараўся прападобнай Ефрасінняй Полацкай, — Спаса-Праабражэнскую царкву. «Гэта вельмі значная духоўная спадчына», — падкрэсліў Патрыяршы Экзарх. Дапамога ў рэстаўрацыі гэтых храмаў была аказана ў адпаведнасці з Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмай.

**«Духоўныя цэнтры, якія служаць месцам прыцягнення, павінны быць у кожнай вобласці»**

У размове з прадстаўнікамі СМІ Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін адзначыў, што пры абмеркаванні святкавання важных для праваслаўя дат у Жыровічах Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, каб у парадак былі прыведзены не толькі Жыровіцкі манастыр, але і яго навакольле. «Традыцыйна мы плануем святочнае богаслужэнне, і да гэтага свята павінна быць усё гатова, — падкрэсліў Уладыка. — Акрамя таго, запланаваны асветніцкія мерапрыемствы, каб наш народ (і школьнікі, і студэнцтва, і старэйшае пакаленне) лепш ведаў аб нашых святынях, святынях беларускай зямлі».

Вялікая і насычаная праграма, па яго словах, падрыхтавана да святкавання 900-годдзя Спаса-Ефрасіннеўскага стаўрапігіяльнага жаночага манастыра ў Полацку. «Створаны спецыяльны аргкамітэт на рэспубліканскім узроўні, праходзяць адпаведныя падрыхтоўчыя мерапрыемствы, — канкрэтызаваў мітрапаліт. — Самі ўрачыстасці пройдуць 4–5 чэрвеня. Чакаем візіт Найсвяцейшага Патрыярха Кірыла да гэтай даты і іншых гасцей. Дата вялікая, значная. Гэта адзін з самых старажытных манастыроў, які захаваўся на тэрыторыі Усходняй Еўропы».

У сувязі з гэтым Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі нагадаў, што нядаўна ў манастыры пасля рэстаўрацыі быў адкрыты старажытны Спаса-Праабражэнскі храм. Ён удакладніў, што туды ўжо можна зайсці наведвальнікам, паглядзець на старажытныя фрэскі, прасякнуцца святлом духоўнасці, якое стваралася пад непасрэдным кіраўніцтвам прападобнай Ефрасінні Полацкай. І ў Жыровічах, і ў Полацку запланаваны адпаведныя хрэсныя ходы, накіраваныя да гэтых святых месцаў.

У розных кутках Беларусі ўзводзяцца і новыя храмы. Як звярнуў увагу мітрапаліт Веніямін, будаўніцтва новых храмаў — гэта сведчанне таго, што жыццё развіваецца, набірае сілу і людзі ўжо не змяшчаюцца ў тых храмах, якія ў нас ёсць. «Сучасны чалавек мае патрэбу ў тым, каб была магчымасць наведаць храм у крокавай даступнасці, калі рытм жыцця дастаткова напружаны, — перакананы ён. — Храмы — гэта разам з тым і ўпрыгажэнне нашых гарадоў, вёсак, паколькі гэта асаблівая архітэктура, якая заклікае да таго, каб чалавек адхіляўся ад мітусні жыццёвай і, знаходзячыся ў храме, адчуваў, што неба на зямлі — гэта сусветная пахвала, як гавораць словы малітвы пры асвячэнні храмаў».

Кажучы аб стварэнні рэлігійных цэнтраў, аб чым на сустрэчы з прадстаўнікамі рэлігійных канфесій гаварыў кіраўнік дзяржавы, Уладыка заўважыў, што такія духоўныя цэнтры, якія служаць месцам прыцягнення, павінны быць у кожнай вобласці. І яны ёсць. «Напрыклад, Гомельская вобласць — гэта старажытная зямля, дзе яшчэ 1020 гадоў таму была заснавана Тураўская епархія, другая пасля Полацкай, — удакладніў мітрапаліт Веніямін. — Гэта і манастыр Святога праведнага Іаана Кармянскага, які з'яўляецца цэнтрам прыцягнення, і ў лепшыя часы туды прыязджалі паломнікі з Украіны, Расіі, Беларусі. Іх было настолькі шмат, што нават не ўмяшчаў храм. На Віцебшчыне мы кажам пра Полацкі манастыр, гродзенская зямля — гэта Жыровічы, Каложа».

Такое месца духоўнага прыцягнення, па словах Уладыкі, павінна быць і ў сталіцы. «Гэта і Кафедральны сабор, і храм Святых Апосталаў Пятра і Паўла, — прывёў прыклад ён. — Думаю, па статусе духоўным цэнтрам закліканы стаць і Храм-помнік у гонар Усіх Святых, бо ў гэтае месца прыязджаюць не толькі беларусы, тут увекавечана памяць аб загінулых за сваю зямлю, Айчыну».

**Вераніка КАНЮТА**
**Фота БелТА**

# Героі былых часоў

**У Музеі абароны Брэсцкай крэпасці Мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой» адкрыліся выстаўкі «Гісторыя ў фотаздымках» і «Кроў сэрца», прысвечаныя 80-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.**

Старшы навуковы супрацоўнік навукова-асветніцкага аддзела Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры Ганна Кляноўская правяла экскурсію для выхаванцаў Маладзёжнага патрыятычнага цэнтра і пазнаёміла з творамі і лёсамі беларускіх пісьменнікаў-франтавікоў.

На выстаўцы «Гісторыя ў фотаздымках» прадстаўлены фатаграфіі Анатоля Паўлавіча Марозава, зробленыя ім падчас Берлінскай аперацыі. Пазней А. Марозаў прысутнічаў пры падпісанні Акта аб безагаворачнай капітуляцыі Германіі і на Нюрнбергскім працэсе. Матэрыялы для экспазіцыі прадставіў Арлоўскі краязнаўчы музей (РФ).

Падчас мерапрыемства госці пазнаёміліся і з творчасцю пісьменнікаў Брэсцкага абласнога аддзялення СПБ, якія пішуць на тэму гістарычнай памяці і Вялікай Айчыннай вайны. Паэтэса Вера Вакула ўспомніла трагічныя старонкі з жыцця родных і блізкіх, якія аказаліся ў віры жудасных падзей вайны, і прачытала вершы, прысвечаныя матчынай мове, роднай вёсачцы Тонеж, якую напаткаў лёс Хатыні, і памяці свайго бацькі. Падарункам музею абароны Брэсцкай крэпасці стаў паэтычны зборнік членаў брэсцкай творчай суполкі «За Радзімы жыццё».

Вядучы бібліятэкар аддзела абанемента Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага Наталля Равенка прадставіла выстаўку кніг сучасных пісьменнікаў, галоўнай тэмай творчасці якіх стала Вялікая Айчынная вайна. Сярод выданняў — «Письма войны» Аляксандра Валковіча, «Выжыць на дарозе смерці» Зінаіды Дудзюк, «Сустрэча ў зялёным жыце» Расціслава Бензерука, «Галавасек» Анатоля Бензерука.



Запамінальным момантам стала выступленне ўдзельнікаў конкурсу чытальнікаў ваеннай паэзіі «Пра герояў былых часоў» — настаўніка СШ № 19 Брэста імя Героя Савецкага Саюза С. І. Сікорскага Вячаслава Керазя і вучня СШ № 31 Мікіты Шаша.

**Таццяна ДЗЕМІДОВІЧ**
**Фота даслана аўтарам**

# На самарскай зямлі

**У Самары з 30 снежня 2024 да 16 лютага 2025 года праходзілі мерапрыемствы XX Міжнароднага конкурсу-фестывалю мастацтваў «Беларусь — мая песня», заснавальнікам і арганізатарам якога выступае Самарская абласная грамадская арганізацыя беларусаў і выхадцаў з Беларусі «Руска-беларускае братэрства 2000».**

На ўдзел у форуме, прысвечаным 80-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне і прымеркаваным да Міжнароднага дня роднай мовы, паступіла больш за дзвесце заявак, з іх звыш шасцідзесяці — з краін блізкага і далёкага замежжа. У трох намінацыях — вакальнае мастацтва, харэаграфічнае мастацтва і мастацкае слова — сваё выканальніцкае майстэрства прадэманстравалі больш за пяцьсот салістаў і ўдзельнікаў творчых калектываў.

Ацэньвала конкурсныя нумары журы пад старшынствам Ірыны Глускай, лаўрэата Губернскай прэміі ў галіне культуры і мастацтва, уладальніка ганаровага знака Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «За ўклад у развіццё культуры Беларусі» і медаля Францыска Скарыны, кіраўніка арганізацыі беларусаў Самарскай вобласці. Сустаршынёй была Вольга Якабсон, дырэктар Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур.

Гран-пры ў намінацыі «Вакальнае мастацтва» быў удастоены народны калектыў вакальны ансамбль «Белая Русь» (мастацкі кіраўнік Аляксандр Сакулін, які выканаў беларускую народную песню «Рэкрут».

У намінацыі «Харэаграфічнае мастацтва» Гран-пры прысуджаны ансамблю народнага танца «Вдохновение» (кіраўнік Маргарыта Варанецкая.

Гран-пры ў намінацыі «Мастацкае слова» атрымаў дуэт у складзе Кацярыны Рудэнчанка і Сергія Бутэнкі, які прадэкламаваў верш Янкі Купалы «Вечарынка». Свой уклад у пастаноўку нумара ўнеслі педагогі — Рыма Абызава і Вольга Бутэнка.

Завяршыўся творчы марафон грандыёзнай канцэртнай праграмай «Свята разам з сябрамі».

**Мікалай БОЙКА**

## Віншуем!

26 лютага свой 60-гадовы юбілей адзначыла вядомая пісьменніца, паэтэса, кінарэжысёр Алена Турава.

Нарадзілася Алена Віктараўна ў 1965 годзе ў Мінску ў сям'і вядомага кінарэжысёра Віктара Турава. Скончыла філалагічны факультэт Белдзяржуніверсітэта (1987), курсы мастакоў-мультыплікатараў пры кінастудыі «Беларусьфільм» (1990). Працуе мастацкім кіраўніком студыі анімацыйных фільмаў кінастудыі «Беларусьфільм».

З вершамі дэбютавала ў 1985 г. у газеце «Знамя юности». Аўтар слоў многіх папулярных песень для кіно і эстрады, а таксама кніг для дзяцей «Рыжик в Зазеркалье» (2011), «Киндервильское привидение» (2013), «Туфелька, полная незабудок» (2021) і іншых. Аўтар кінасцэнарыяў многіх анімацыйных фільмаў. Лаўрэат шэрагу літаратурных конкурсаў і фестываляў.

Калегі віншуюць шаноўную Алену Віктараўну з юбілеем, жадаюць моцнага здароўя, творчага даўгалецця і вялікага чалавечага шчасця!

# Падвялі вынікі

**Адбыўся справаздачны сход Мінскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі. Літаратары з усіх куткоў прысталічнага рэгіёна сабраліся ў абласной бібліятэцы імя А. С. Пушкіна і падвялі вынікі працы за 2024 год.**

На ўліку ў Мінскім абласным аддзяленні СПБ 83 літаратары. У мінулым годзе пайшлі з жыцця Уладзімір Ласенка, Уладзімір Рунцэвіч і Аляксандр Быкаў. Папоўнілі абласную суполку: Аляксандр Бычкоўскі, Лідзія Гардынец, Іван Мітрайкін, Паліна Корнева і Максім Хацкевіч.

Выдадзена 65 кніг агульным накладам больш за 42 000 асобнікаў. Падрыхтаваны даведнік кніг, выдадзеных пісьменнікамі Мінскага абласнога аддзялення СПБ у 2024 годзе.

Значнай падзеяй у рамках святкавання 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў стаў сумесны з Мінскім абласным цэнтрам народнай творчасці праект па выданні зборніка песенных твораў «Радзімы песенныя сцежкі» (вершы і музычныя ноты да іх), напісаных на вершы літаратараў аддзялення.

Пісьменнікі Міншчыны ў 2024 годзе шырока адзначыліся ў рэспубліканскіх літаратурных часопісах «Полымя», «Нёман», «Маладосць», а таксама ў штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва».



*Фота з сайта pushkinka.by*

У рэгіянальных і рэспубліканскіх грамадска-палітычных масмедыя было змешчана 386 публікацый. На радыё і тэлебачанні адбылося 59 выступленняў. У розных СМІ размешчана 17 інтэрв'ю з пісьменнікамі Міншчыны.

За год членамі аддзялення праведзена 647 сустрэч з чытачамі ў бібліятэках, са школьнікамі і вучнямі розных навучальных устаноў і іншымі катэгорыямі грамадзян.

Працягвалася творчае супрацоўніцтва з Дзяржаўным пагранічным камітэтам па выпуску літаратурнага альманаха «Граніца літаратурная». Была наладжана ваенна-шэфская работа з Групай матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння органаў пагранічнай службы, якая дыслацыруецца ў горадзе Дзяржынску. Плённае супрацоўніцтва ажыццяўлялася з Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры. Прадукцыйна аддзяленне СПБ працавала і з бібліятэкамі вобласці, асабліва з Мінскай абласной. Добрыя стасункі ў раённых бібліятэк і пісьменнікаў па месцы жыхарства.

Краязнаўца Уладзімір Ліхадзедаў стаў лаўрэатам Прэміі Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі ў галіне літаратуры і мастацтва. Паэт Хведар Гурыновіч адзначаны званнем лаўрэата Нацыянальнай літаратурнай прэміі ў намінацыі «Паэзія» за кнігу «Паляўнічая паэма».

Кандыдат гістарычных навук Барыс Далгатовіч за шматгадовую плённую літаратурна-навуковую працу ўзнагароджаны медалём Францыска Скарыны. Граматай Саюза пісьменнікаў Беларусі ўзнагароджаны паэт-песеннік з Мінскага раёна Кастусь Цыбульскі, дзіцячая пісьменніца з Уздзеншчыны Галіна Нічыпаровіч, дзяржынскі паэт Антон Анісовіч. Паэма «Легенда Заслаўя» Святланы Быкавай, творы Кацярыны Хадасевіч-Лісавой «Ключ ад вялікай каштоўнасці» і Генадзя Аўласенка «Чаму Дукоры такую назву маюць» уключаны ў зборнік для пазакласнага чытання па беларускай літаратуры для вучняў 6-х класаў.

У планах на бягучы год — сумеснае з Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры выданне калектыўнага зборніка «У іх жыцці была вайна» з творамі пісьменнікаў абласнога аддзялення — ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і «дзяцей вайны»; сумесна з Дзяржаўным пагранічным камітэтам Рэспублікі Беларусь — выданне святочнага нумара альманаха «Граніца літаратурная» да дня Вялікай Перамогі з творамі пісьменнікаў Міншчыны пад агульнай назвай «Межы Радзімы — месца бязмежнага гераізму»; выданне кніжнай серыі «Бібліятэчка Мінскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі» ў падтрымку маладых аўтараў.

**Нэлі МЕЛЬНІЧЭНКА**

# Калі сніцца шчасце

**У Мінскім гарадскім тэатры паэзіі, што працуе пры Цэнтральнай бібліятэцы імя Янкі Купалы, адбылася паэтычна-музычная імпрэза «Яшчэ мне шчасце сніцца...», прысвечаная творчасці вядомай паэтэсы і перакладчыцы Аліны Легастаевай. Аўтар сцэнарыя і вядучая — мастацкі кіраўнік Тэатра паэзіі Вольга Багушыньска.**

Адкрыла мерапрыемства дырэктар Цэнтралізаванай сістэмы дзяржаўных бібліятэк горада Мінска Алена Матвеева. Яна выказала падзяку паэтэсе за плённае супрацоўніцтва і ўручыла памятны падарунак. Узнёслыя словы пра творчасць і асобу Аліны Легастаевай сказаў старшыня Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Міхась Пазнякоў. Ён даў высокую ацэнку паэзіі А. Легастаевай, яе патрыятычнай пазіцыі, грамадскай актыўнасці, уручыў Ганаровую грамату СПБ і любімыя кветкі паэтэсы. Горача вітала і віншавала паэтэсу старшыня Беларускага саюза кампазітараў Алена Атрашкевіч. Нямала добрых слоў пра віноўніцу творчай урачыстасці сказаў і яе аднавясковец, вядомы літаратуразнавец, кандыдат філалагічных навук Міхась Кенька.

Песні на вершы А. Легастаевай прагучалі ў выкананні Экзаршага інклюзіўнага хору «Радасць душы» (кіраўнік Алена Маслава, канцэртмайстар Тамара Гетман), узорнага хору сталічнай гімназіі № 4 «Сябрына» (кіраўнік Таццяна Барташук, канцэртмайстар Яна Макаркова). Музыку да іх напісала вядомы кампазітар Аліна Безенсон.

Прагучала таксама і песня, напісаная на словы Аліны Легастаевай вядомым кампазітарам Аленай Атрашкевіч. Яе выканала маладая спявачка Ганна Варанко. Гледачы ўдзячна апладзіравалі і заслужанай артыстцы Беларусі Надзеі Мікуліч, спевакам Вользе Гарнічар і Віктару Мяцельскаму, у выкананні якіх прагучалі песні на вершы паэтэсы.

Душэўна чытала свае вершы і сама Аліна Легастаева. Пранікнёна, па-майстэрску дэкламавала вядомая артыстка тэатра і кіно Вольга Багушыньска, а таксама артысткі Тэатра паэзіі Святлана Яфрэмава, Ганна Красоўская. Завіталі на вечарыну і сябры паэтэсы з Лагойска, дзе яна працавала ў школе педагогам. З Круляўшчызны, дзе знаходзіцца лецішча Легастаевай, прыехала яе сяброўка Наталля Галубок, сваячка знакамітага Уладзіслава Галубка.

Аліна Антонаўна падарыла бібліятэчнай сістэме свае кнігі. Прысутныя таксама мелі магчымасць атрымаць зборнік з аўтографам.

Бібліятэка падрыхтавала выстаўку выданняў.

**Павел КУЗЬМІЧ**

# Гімназістам — пра сучаснасць

У гімназіі Ляхавіч прайшла лекцыя-прэзентацыя на тэму «Сучасная беларуская літаратура», якую правёў старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі, дырэктар выдавецтва «Беларусь» Алесь Карлюкевіч.

Розныя імёны празаікаў і паэтаў гучалі падчас сустрэчы. Была названа літаратурная падзея 2024 года: пісьменнік і выдавец выпусціў аповесць Уладзіміра Васько «Падземны горад», прысвечаную сучаснаму жыццю, адносінам паміж людзьмі з розным сацыяльным статусам, фантазійнаму стаўленню да рэчаіснасці. (Аповесць была надрукавана летась у часопісе «Полымя»). Размова ішла таксама пра Алеся Бадака, які нарадзіўся ў Ляхавіцкім раёне, і яго аповесці «Нелюдзімы», «Адзінокі васьмікласнік хоча пазнаёміцца», пра Андрэя Федарэнку і яго творы «Дзікі луг», «Вёска», «Жэтон на метро», пра маладых пісьменнікаў — Паліну Дваранскую, якая толькі што паступіла ва ўніверсітэт, Настассю Нарэйку, якая працуе ў газеце «Навіны Камянеччыны». Творы гэтых і іншых сучасных пісьменнікаў прадстаўлены ў серыі кніг «Сучасная беларуская літаратура», створанай Саюзам пісьменнікам Беларусі і выдавецтвам «Аверсэв».

Алесь Карлюкевіч адказаў на шэраг пытанняў настаўнікаў, кіраўніцтва гімназіі пра сучасны стан кнігавыдання, пазнаёміў з навінкамі выдавецтва «Беларусь», асобна спыніўся на героіка-патрыятычнай літаратуры. Напрыклад, да 80-годдзя Вялікай Перамогі прымеркавана кніга пра спаленыя вёскі Берасцейшчыны.

**Сяргей ШЫЧКО**

# Пад аховай Ефрасінні

## Годна

Дакументальны фільм «Прыстанак святой Ефрасінні» прымеркаваны да 900-годдзя заснавання Полацкага стаўрапігіяльнага Спаса-Ефрасіннеўскага жаночага манастыра. Стаўрапігіяльны — той, што падпарадкоўваецца непасрэдна мітрапаліту. Гэта гонар і асаблівы статус, з чым трэба было лічыцца і здымачнай групе, якая ў гэты адасоблены куточак з адмысловым ладам жыцця прыўнесла частку нашай свецкай мітусні… Здавалася б, няпроста ў такіх умовах і тутэйшым насельніцам, і здымачнай групе, бо манастырскі свет даволі закрыты, але ёсць выпадкі, калі трэба сведчыць пра вялікую боскую справу, і добра, каб гэтую працу зрабілі з разуменнем…

Але калі справа тычыцца святой Ефрасінні, то яна нібыта натхняе. І не толькі яна. На сваю працу здымачная група атрымала благаславенне Мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Веніяміна, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі, які падчас прэм'еры ў сталічным кінатэатры «Перамога» адзначыў:

— Фільм прысвечаны найстаражытнейшаму манастыру на беларускіх землях і ва ўсходнеславянскім свеце. Манастыр, заснаваны святой, мае няпростую гісторыю, сугучную з гісторыяй нашага народа. І ў цяперашні час мы сведчым пра тое, што старажытны храм адноўлены дзякуючы намаганням дзяржавы і непасрэдна пры падтрымцы Прэзідэнта нашай краіны. Сёння мы бачым гэты храм ва ўсёй яго велічы і прыгажосці. Фільм — цудоўная магчымасць для тых, хто не можа даехаць да манастыра, але хоча больш пра яго ведаць, пазнаёміцца са святыняй. А тым, хто ўжо пабываў у Полацку, ён дасць глебу для разважанняў, бо адкрывае некаторыя невядомыя гледачу старонкі жыцця манастыра. І ў гэтым каштоўнасць падыходу. Асабліва хочацца падзякаваць за тое, што быў знойдзены поўны глыбокай пашаны падыход у перадачы гісторыі і самога зместу жыцця прыстанку ў Полацку, каб гледачы пастараліся зразумець сутнасць подзвігу прападобнай Ефрасінні, сутнасць манаскага жыцця ў сучасным свеце і высокага служэння манастыра, які ад зямлі скіроўваецца да неба. Гэта магчымасць больш даведацца пра некаторыя раней не вядомыя старонкі існавання манастыра.

## Цудоўна

Дакументальная стужка кінастудыі «Беларусьфільм» зроблена згодна з прынцыпамі асветніцтва: яна нібыта прыадкрывае патаемнае, не гаворачы наўпрост. Не заклікае, а дае прыклад. І гэта прыклад служэння святой, якая



лічыцца апякункай усёй Беларусі. Аўтары сцэнарыя — рэжысёр Уладзімір Луцкі і пісьменніца Людміла Рублеўская — узялі за аснову «Жыціе прападобнай Ефрасінні Полацкай»: так пра яе пачынаюць распавядаць дзецям, якія, можа, быць, упершыню чуюць гэтае імя. Але прыслухоўваюцца: князёўна Прадслава была яшчэ зусім юнай, калі зрабіла свой галоўны выбар у жыцці — служэнне Богу і людзям. Нягледзячы на тое, што, з'яўляючыся дачкой Полацкага князя, магла б мець цалкам уладкаванае жыццё. Была прыгожая, і жаніхі да яе прыглядаліся, а яна выбрала сабе жаніха нябеснага. Сама прыняла пострыг, а за ёй — і дзве яе сястры: вось што значыць прыклад. Ёй па сілах былі вялікія справы, якія здзяйсняліся цудоўным чынам. Пра жыццё святой і некаторыя цуды, што здараюцца нават у наш час па гарачых малітвах, распавядае ігумення Еўдакія (Ляўшук). Напрыклад, пры стварэнні манастыра ў Сяльцы ёй для будаўніцтва Спаса-Праабражэнскага храма не хапала плінфы. А вельмі хацелася скончыць працу ў пэўны тэрмін. Ефрасіння маліла Бога, каб дапамог нейкім чынам вырашыць пытанне. І ранкам работнікі знайшлі патрэбную колькасць цэглы ў печах, якія яшчэ вечарам былі пустыя…

Без яе веры і імпэту і сапраўды не паўстаў бы дзіўны храм, створаны дойлідам Іаанам, не было б і загадкавага айчыннага сімвала — крыжа, створанага Лазарам Богшам. А яшчэ ж яна творыць цуды, нават цяпер — дапамагае тым, хто шчыра просіць яе ў малітоўных зваротах. Напрыклад, ацаляе людзей па шчырых малітвах іх блізкіх. Такім чынам, заснаваны прападобнай Ефрасінняй Полацкай манастыр і сёння з'яўляецца месцам, дзе штодзённа ажыццяўляюцца тысячы добрых спраў, дзе няспынна гучыць малітва за Беларусь і наш народ.

Фактычна кожны глядач праз фільм атрымлівае магчымасць здзейсніць своеасаблівую экскурсію па манастыры: аглядае тэрыторыю, разам з насельніцамі ходзіць на богаслужэнні, слухае іх спевы і нават назірае за працэсам выпякання просвір — як яшчэ гэта было б магчыма? І так ці інакш, але кожны вядзе асабістую размову з Ефрасінняй, бо яе жыццё і сапраўды можа падацца сучаснаму чалавеку шмат у чым дзіўным.

Здзіўляцца не будзе той, каму ўдалося паглыбіцца ў жыццё полацкага манастыра. А людзі з камерай — гэта для насельніц тое яшчэ выпрабаванне, бо ў іх свой распарадак. Матушка Іусціна ад імя ігуменні Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра Еўдакіі падзякавала кінамайстрам за працу:



— Вялікім суцяшэннем для нас была згода рэжысёра стварыць традыцыйны дакументальны фільм пра святую, без пастановачных сцэн. Мы ўдзячныя ўдзельнікам здымачнай групы, якія працавалі ў манастыры далікатна і акуратна, так, што мы не выходзілі за межы правіл манаскага жыцця. Рэжысёру ўдалося распавесці не толькі пра жыццё і подзвігі прападобнай Ефрасінні, але і прыадкрыць гледачу заслону паўсядзённага жыцця манастыра.

## Натхняльна

Уладзімір Луцкі, рэжысёр фільма, падзякаваў манашкам за клопат пра здымачную групу і згадаў смачныя манастырскія абеды. Але сілкавалі не толькі яны, а агульная справа, якую кожны са свайго боку імкнуўся зрабіць як мага лепш. Нягледзячы на тое, што гэта было няпроста: у манастыры ішлі будаўнічыя і рэстаўрацыйныя работы, і гэта вельмі ўскладняла працэс здымак. Але яны пачыналіся вясной мінулага года — і гэты настрой абуджэння адчуваецца. Магчыма, яго дапамагае стварыць квецень, якая трапляе ў кадр? Ці наогул неверагодная напоўненасць святлом? Бо аўтары хацелі зрабіць прыгожы і вобразны фільм, перадаўшы чароўную атмасферу ўсяго манастыра і дзіўнага Спаса-Праабражэнскага храма, цалкам распісанага фрэскамі.

За гэтае дзіва, хутчэй за ўсё, трэба дзякаваць самой святой Ефрасінні. Яна, можа, і не трымала ў руках пэндзаль, але дакладна з'яўлялася натхняльніцай таго, што павінна быць у выявах, бо з ёю, як з заказчыцай, узгадняліся і архітэктура, і напаўненне храма. Натхняльніца: на адной з фрэсак паўстае яе постаць у поўны рост. На жаль, нам не дадзена ўбачыць твар Ефрасінні — менавіта гэты фрагмент фрэскі страчаны. Але гэта адзіная выява, дзе ў яе няма німба. Затое ў руках трымае храм, які падносіць як падарунак Госпаду. На ім у два шэрагі ідуць трохлопасцевыя какошнікі — гэтая форма менавіта адсюль стала распаўсюджвацца ў старажытнарускай архітэктуры.

Храму прысвечана вялікая частка фільма, дзе вуснамі спецыяліста агучваюцца некаторыя нюансы, на якія не кожны зверне ўвагу. А яны паказальныя. Ефрасіння-заказчыца: яна спланавала ў храме келлю справа — для сябе, а злева — для сястры. Але ў гэтых келлях ёсць акенцы, і калі глядзіш у іх, то з аднаго боку бачыш вялікую фігуру прападобнага Сімяона Стоўпніка, а з другога — прападобнага Данііла Стоўпніка. Так манашкі мелі перад вачыма прыклад служэння Госпаду.

У фільме распавядаюць пра тое, як пачыналася рэстаўрацыя храма, — фактычна з раскрыцця жывапісу. Аказалася, што фрэскі маюць некалькі слаёў, і пад больш познім захаваны роспіс часоў Ефрасінні. Работы пачаліся ў 90-я гады мінулага стагоддзя, спачатку беларускім майстрам-жывапісцам, а пасля прыцягнулі расійскіх рэстаўратараў, якія мелі багаты досвед работы на падобных аб'ектах, далучыліся і айчынныя спецыялісты. Так пакрысе рэстаўратарам удалося адслаіць увесь алейны роспіс больш позняга перыяду, ён максімальна захаваны. Цяпер гэты жывапіс можна паглядзець у полацкім музеі. А ў храме ўбачыць раннія фрэскі — ці не цуд-падарунак ад Ефрасінні за ўвагу да яе спраў?

Яна спачывае ў полацкім Спаса-Праабражэнскім манастыры. Тут для святой стварылі раку са срэбра. Цяперашнія манашкі сцвярджаюць: наша святая вельмі ўдзячная за пашану і адказвае на дабро дабром дапамогай. Да святой, якая лічыцца апякункай Беларусі, штодня ідуць людзі са сваімі клопатамі і просьбамі ў чаканні цудаў. Яна чуе… Але кожны глядач фільма зможа ўпэўніцца ў гэтым сам: звяртацца да святой Ефрасінні можна не толькі ў манастыры.

— Фільмы пра такіх выдатных асоб і святых вельмі важныя, — адзначыў міністр культуры Беларусі Руслан Чарнецкі, які агучыў стужку. — Я радуюся, што прэм'ера выклікала вялікую цікавасць. Гэта сур'ёзная праца, якая знойдзе водгук не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі.

**Ларыса ЦІМОШЫК**



**Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.**

# Элегія возера Шэлахава

**12 лютага, як паведамлялася ўжо, не стала Генадзя Пацыенкі — ганаровага акадэміка Пушкінскай акадэміі, лаўрэата рэспубліканскага літаратурнага конкурсу «Найлепшая кніга 2008 года» і Віцебскай абласной літаратурнай прэміі імя Уладзіміра Караткевіча, ганаровага грамадзяніна Лёзненскага раёна, выдатнага пісьменніка і цудоўнага чалавека. Адметна і тое, што, маючы кватэру і сям'ю ў Маскве, ён не адзін дзясятак гадоў жыў на сваёй малой радзіме, у вёсцы Зубакі Лёзненскага раёна. Гэта непадалёку ад возера Шэлахава. Успамінаючы Генадзя Барысавіча ў гэтыя журботныя дні, так і хочацца аповед пачаць менавіта з яго, бо возера гэтае стала яго сувяззю з малой радзімай. Так узнікла і назва згадак: элегія возера Шэлахава. Хай сабе і не верш, як вымагае жанр, а ўсё адно адпавядае таму, што звязвала Генадзя Пацыенку з гэтым кутком Бацькаўшчыны.**

Першы раз з ім сустрэўся, калі працаваў першым намеснікам галоўнага рэдактара часопіса Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Беларуская думка». Паехалі на Віцебшчыну разам з галоўным рэдактарам Уладзімірам Вялічкам, а арганізаваў гэтую паездку ў Зубакі начальнік упраўлення ідэалогіі Віцебскага аблвыканкама, пісьменнік Міхаіл Кузьміч, сябра Генадзя Барысавіча. Пасля было яшчэ некалькі паездак. У тым ліку і са старшынёй Віцебскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Тамарай Красновай-Гусачэнка. Апошняя адбылася, калі я ўжо працаваў у рэдакцыі часопіса «Нёман». Былі тады са мною Алесь Карлюкевіч, Наталля Касцючэнка, Міхась Пазнякоў. І кожны раз радавое гняздо Генадзя Барысавіча ўсё больш прываблівала.

Менавіта так ён называў Зубакі, хоць нарадзіўся ў суседнім Заазер'і, але пазней па дакументах праходзіў зубакоўцам. Аднак у пасведчанні аб нараджэнні, якое цудам захавалася падчас Вялікай Айчыннай вайны, месцам нараджэння называецца Заазер'е. Памятаю, як запытаўся:

— А ці не захацелася ўнесці яснасць у пашпарт? Усё ж Заазер'е — часцінка малой радзімы?

Генадзь Пацыенка паглядзеў здзіўлена. У яго позірку адчувалася адно яму вядомае:

— У Зубаках маё радавое гняздо.

Толькі пазней, калі пазнаёміліся як след, дайшло да мяне, што ён разумее пад гэтым паняццем. Прыгадваючы месца нараджэння многіх знакамітых людзей, звычайна гаворым аб іх дваранскіх каранях. Ведаем, як яны гэтым ганарыліся. Забываем, што нешта падобнае жыло і ў душах простых людзей, якія не толькі з гонарам людзьмі зваліся, але і не забывалі аб сваіх вытоках. Што ўжо казаць пра Генадзя Пацыенку, біяграфія якога не толькі як пісьменніка, але і як чалавека сама па сабе заслугоўвае падрабязнага аповеду. У ёй істотны і такі факт: не хацеў, каб пасля яго радавое гняздо абы-каму засталося. Прапаноўваў перапісаць яго ў спадчыну… рэдакцыі часопіса «Беларуская думка». Адмовіліся, палічыўшы што з Мінска ў Зубакі дабірацца далёка. А можа, і добра зрабілі. Няма ўжо Уладзіміра Вялічкі, няма і Міхаіла Кузьміча, а Генадзь Барысавіч так шмат пражыў.

Ён не толькі пісаў цікавыя творы, выдатным апавядальнікам быў. Шкада толькі, што не ўсё занатаваў. Ды яно засталося ў памяці тых каму пра гэта расказваў. Пачынаючы з гадоў маленства. Слухалі яго і чарговы раз упэўніваліся, што самы вялікі раманіст — гэта жыццё. Сюжэты так і прасіліся ў творы. Пачынаючы з таго, што адбывалася ў пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

Калі гітлераўцы падпалілі Зубакі, з дарослымі пайшоў у партызанскі атрад. Вярнуўшыся пасля вызвалення Лёзна, ніводнага дома не ўбачылі. Ды яшчэ паўсюдна былі схаваны міны. Сям'я пачала капаць зямлянку ў суседніх Гарэліках. Аднак тут прыйшла вестка, што ў Мерзлякове, дзе жылі родзічы, усе дамы цэлыя, фашысты не паспелі іх знішчыць. Пасяліліся ў хату, дзе размяшчаліся афіцэры з франтавой агітбрыгады. І яны падказалі Генадзю, як стаць… пісьменнікам. Неверагодна? Гледзячы, як да ўсяго падысці.

У іх быў друкарскі станок, на якім набіралі тэкст. У яго ставілі драўляныя міны з дзвюх палавін. А ў іх знаходзіўся тэкст з «пасланнем» да немцаў. Гэты зварот і пасылалі ў іх размяшчэнне. Агітавалі здавацца. Бяда, што часу не хапала разгорнуты тэкст напісаць. Убачыўшы, наколькі дапытлівы Гена, прапанавалі яму. Ведалі, што, хоць у школе яшчэ не вучыўся, чытаць і пісаць умее. Далі паперу, аловак. Паглядзеўшы, што напісаў, здзівіліся. Хтосьці сказаў: «Відаць, пісьменнікам стане». А ён яшчэ і не ведаў, што гэтае слова азначае. Калі ж прынеслі ежу ў кацялку са словамі: «Ну, пісьменнік, давай палудней», зразумеў, да чаго трэба імкнуцца.

Пры кожным нашым прыездзе Генадзь Барысавіч расказваў штосьці такое, што хоць таксама бяры і кладзі ў аснову мастацкага-дакументальнага апавядання. Напрыклад, пра тое, што з маленства палюбіў рускія народныя песні, рамансы, арыі з опер у выкананні знакамітых спевакоў, у тым ліку Фёдара Шаляпіна. Здавалася б, адкуль ім узяцца ў вясковай глыбінцы? Толькі не адкуль, а ад каго.

Упачатку вайны бежанцы падарылі сям'і новы патэфон. Ды ў прыдачу 30 пласцінак. Бацькі са сваім няхітрым пажыткам гэты падарунак паклалі ў куфар і закапалі ў агародзе. Вярнуўшыся пасля вызвалення вёскі, убачылі чырвонаармейцаў, якія сядзелі і слухалі музыку. Дзіва дый годзе! Як яны маглі здагадацца пра схову? Падказаў правал у зямлі. Пачалі раскопваць, а ў ім і ўбачылі куфар.

> ***Праца журналістам паспрыяла знаёмству з многімі пісьменнікамі, шмат якія з іх сталі і яго сябрамі. Ужо гэтыя прозвішчы шмат гавораць: Юрый Бондараў, Валянцін Распуцін, Канстанцін Сіманаў, Уладзімір Чывіліхін… А Іван Стаднюк, наведаўшы яго радавое гнязло, нават ёлку пасадзіў. Можа, хто запамятаў, хто гэта такі? Аўтар рамана «Война», а раней па яго сцэнарыі быў зняты фільм «Максим Перепелица», які меў вялікі поспех.***

Не менш дзіўнае з'яўленне ў радавым гняздзе калодзежа. Самі таго не жадаючы, пастараліся немцы. Таксама ў пачатку вайны, калі чырвонаармейцы адступалі. Адна з бомбаў упала непадалёку ад дома Пацыенкаў. Адразу ў гэтым месцы прабілася наверх вада. Так і з'явіўся



*Генадзь Пацыенка.*

калодзеж. Ужо жывучы ў Зубаках, Генадзь Барысавіч паставіў у ім бетонныя кольцы. Чаму і не пастарацца, калі, здаўшы ваду на аналіз, даведаўся, што яна жыццядайная: ёсць мікраэлементы, раставаральныя солі, ды і шмат чаго іншага, што для здароўя патрабуецца.

Апавядаў ён нямала і іншага, якое лішні раз пацвярджае думку: што ні чалавек — гэта непаўторнасць, што ні род — столькі звязана з ім, хоць кнігу пра гісторыю яго пішы. Адно цяжка — не захавалася многіх падрабязнасцей. А тут яны самі, як кажуць, у рукі просяцца. І, кожны раз прыязджаючы ў Зубакі, мы даведваліся цікавае. Як, напрыклад, гісторыя, звязаная з жорнамі. Яны ў іх сям'і былі даўнія. Як даведаўся Генадзь Барысавіч ад бацькі, ім было ледзь не чатыры сотні гадоў, а можа, і болей. Перадаваліся па спадчыне. Ад дзядулі Генадзя Пацыенкі, які быў святаром, перайшлі да яго бацькі. Ён жа перад смерцю паклаў іх у хлеў, прасіў берагчы. Сын і сам гэта разумеў. Памятаў, як у акупацыю малолі муку для партызан. Памятаў і іншае: з хлеба, выпечанага для іх, маці забараняла нават скарыначку адломваць. І тое памятаў, як, адыходзячы ў лес, схавалі жорны ў зямлі. Вырашыў напісаць гісторыю пра іх, а жорны аддаць у музей. Паклаў пад сасну, каб знайсці які-небудзь транспарт. Ды захварэў. Вярнуўся з бальніцы, а жорнаў няма…

Ды хопіць пра тое, што Генадзя Пацыенку атуляла з маленства, хоць, безумоўна, усе гэтыя выпадкі ў той ці іншай ступені і спрыялі фарміраванню характару, стаўленню да жыцця. Час сказаць і пра яго жыццёвыя ўніверсітэты. У Зубаках скончыў пачатковую школу, пасля — сямігодку ў Дабрамыслях. Сёння гэта аграгарадок, на могілках якога і знайшоў ён свой вечны спачын. Затым падаўся ў фабрычна-заводскае вучылішча чыгуначнікаў, што знаходзілася ў Віцебску. Навучэнцаў яго тады называлі фабзайцамі. А што хацеў стаць чыгуначнікам — зразумела: непадалёку праходзіла чыгунка. Але на гэтым навучанне не скончылася. Апынуўшыся ў Гродне, завочна атрымаў і сярэднюю адукацыю. Два гады працаваў на цаліне, служыў танкістам у войску. Звольніўшыся ў запас, уладкаваўся токарам на гродзенскі завод «Аўтазапчастка».

Так і напрошваецца пытанне: а як жа ён, жартам названы чырвонаармейцамі пісьменнікам, стаў ім? Відаць, мог бы зрабіць гэта, жывучы і ў іншым горадзе, бо ўжо штосьці пісаў, як кажуць, для сябе. Але ў іншых абласных цэнтрах не было Васіля Быкава. А Васіль Уладзіміравіч загадваў аддзелам літаратуры ў газеце «Гродненская правда». Стараўся кожнага аўтара, у каго бачыў задаткі таленту, падтрымаць. Дзякуючы яму ў «ГП» Генадзь Пацыенка і дэбютаваў. Атрымаў ад яго і лісты з добрымі пажаданнямі, пазначаныя 1960 годам, а ў канцы значылася «Твой Васіль». Пасябравалі не ў апошнюю чаргу і таму, што абодва аказаліся з Віцебшчыны.

Васіль Уладзіміравіч, адчуўшы ў Генадзя Пацыенкі немалыя творчыя задаткі, вырашыў яго падтрымаць. Хутка і магчымасць з'явілася. У Доме творчасці пісьменнікаў «Каралішчавічы» пад Мінскам ладзіўся семінар маладых пісьменнікаў. Накіраваў яго з іншымі маладымі аўтарамі Гродзеншчыны. А там для Генадзя Барысавіча — чарговая неспадзеўка. Калі абмяркоўвалі яго новыя творы, адзін выступоўца сказаў:

— Параіў бы маладому чалавеку не на заводзе працаваць, а пайсці вучыцца.

Пачуўшы гэтыя словы, Іван Шамякін пагадзіўся:

— А чаму б і не. Напішу рэкамендацыйнае пісьмо ў Літаратурны інстытут у Маскве, а табе, — звярнуўся да яго, — раю хутчэй дасласць свае творы.

Так Генадзь Барысавіч стаў студэнтам Літаратурнага інстытута імя Максіма Горкага. Дарэчы, паспяхова пераадолеўшы конкурс 85 чалавек на месца. Добра праявіў сябе і ў час вучобы. Пасля заканчэння яе скончыў і аспірантуру. Выкладаў у інстытуце, працаваў у рэдакцыі часопіса «Молодая гвардия», а з 1972 да 1980 года ўзначальваў знакамітую «Роман-газету». За гэты час тыраж яе вырас ад мільёна да двух з палавінай. Некаторы час быў дарадцам Міністэрства па справах нацыянальнасцей Расійскай Федэрацыі. Па яго ініцыятыве з'явіўся спецыяльны выпуск часопіса «Жизнь национальностей» (1997, № 1), прысвечаны стварэнню Саюза Расіі і Беларусі.

Праца журналістам паспрыяла знаёмству з многімі пісьменнікамі, шмат якія з іх сталі і яго сябрамі. Ужо гэтыя прозвішчы шмат гавораць: Юрый Бондараў, Валянцін Распуцін, Канстанцін Сіманаў, Уладзімір Чывіліхін… А Іван Стаднюк, наведаўшы яго радавое гняздо, нават ёлку пасадзіў. Можа, хто запамятаў, хто гэта такі? Аўтар рамана «Война», а раней па яго сцэнарыі быў зняты фільм «Максим Перепелица», які меў вялікі поспех.

Генадзь Пацыенка і сам плённа працаваў. Выдаў 17 кніг прозы: «Кольцевая дорога», «Дом без соседей» «Зал ожидания», «Пистолет в чемодане», двухтомнік «Избранное». Друкаваўся ў многіх перыядычных выданнях. Асобнай кнігай выйшла аповесць «Пока пуля летит», якая ў перакладзе аўтара гэтых радкоў друкавалася ў часопісе «Маладосць». Яна была адзначана сярэбраным медалём Міжнароднага саюза славянскіх журналістаў.

…Толькі прыжмурыш вочы, як у памяці ажываюць да драбніц знаёмыя краявіды радавога гнязда Генадзя Барысавіча. Каля ўвахода самотна стаіць лаўка, зробленая ім. У двары — 150-гадовы, а можа, і 200-гадовы дуб маркотна скрыпіць галлём, чакаючы свайго гаспадара. Непадалёку ад дуба — калодзеж, які здзіўляецца, чаму ніхто не прыходзіць па ваду. Ды і ёлка, пасаджаная Іванам Стаднюком, не разумее, чаму ніхто не падыходзіць да яе. А лодка, перакуленая дагары дном, непакоіцца, што яе ніхто не рыхтуе да вясны.

Чакае яго, як заўсёды, і возера Шэлахава. Магчыма, нават больш, чым іншыя. Даўно ўпэўнілася, які гэта заўзяты рыбак, то чаму не парадаваць яго ўловам? Ды і віну перад ім адчувае. Столькі часу прайшло, але змірыцца з тым, што адбылося, не можа. Патануў у ім брат Генадзя Барысавіча. Непакоіцца, чаму няма гаспадара, і пяцёра катоў, якія жылі ў яго. Знайшліся б добрыя людзі, каб прытулілі іх.

**Алесь МАРЦІНОВІЧ**

# Магутны антываенны твор

**У розныя перыяды маёй журналісцкай працы даводзілася чуць споведзі былых вязняў фашысцкіх канцлагераў, у тым ліку тых, хто перажыў жахі Азарыцкіх лагераў смерці. Таму, калі Уладзімір Гаўрыловіч прапанаваў азнаёміцца з напісанай ім аповесцю «Пад покрывам нябёсаў», было вельмі цікава: як падаецца гэтая дакументалістыка ў літаратурным жанры — аповесці. І, ведаеце, з першай старонкі адчувала сваю непасрэдную прысутнасць там.**




Згадалася гутарка восенню 2021 года ў вёсцы Сцяпы Жлобінскага раёна з Валянцінай Іванаўнай Жураўлёвай, якая 5-гадовай дзяўчынкай разам з дзядулем, маці, а таксама чатырохгадовай і паўтарагадовай сястрычкамі, усяго тыднёвым ад нараджэння брацікам перажыла такое жудаснае выгнанне. Прывяду толькі адзін фрагмент яе аповеду, надрукаванага ў «Гомельскай праўдзе» 4 лістапада 2021 года: «…На балоце купіны, вакол вада. Пакрывала нейкае мама распяла на кусце. Пад ім адзін да аднаго туліліся. Мокрыя Ванькавы полкі-плянёнкі вакол свайго цела абкруціць, так сушыла. Ваду пілі з таго балота. Людзі паміралі. Не дай бог гэтага нікому зведаць, іх фашысцкага парадку!»

Уладзімір Гаўрыловіч нездарма ўводзіць у шэраг галоўных «герояў» аповесці ялаючую выварацьць — схованку для сям'і Кудзелькаў: «Шчыльна прыціснуўшыся адзін да аднаго — маці пасярэдзіне, сынок з аднаго боку, а абяссіленая дачушка на мамчыных руках, — сямейка старалася хоць трохі сагрэцца. Маці скінула з сябе суконную хустку, накрыла сваіх крывінак паверх зрэбнай вопраткі, спадзеючыся, што хоць крыху схавала іх ад знобкага холаду адлігі».

Вось такім чынам людзі на скупым сакавіцкім балоце чапляліся за жыццё, і дапамагала ім зямелька родная дзе лапікам снегу, дзе ягадкамі журавін, карэньчыкамі. Так дапамагала зямелька родная! Чытачы старэйшага пакалення, безумоўна, узнаўляюць у памяці хранікальна-дакументальныя кадры тэлебачання пра азарыцкую трагедыю, у якой пацярпелі каля 50 тысяч чалавек. Чытач аповесці У. Гаўрыловіча скурай адчувае той пранізлівы холад, неймаверны голад, лютасць гітлераўцаў і іх памагатых. І разам з тым — ахвярнасць маці, якія аддаюць апошняе, каб толькі ўратаваць дзяцей. Вось на што ідзе Агрыпіна, маці Палінкі: «Стары быў яшчэ цёплы. Цела яго было не падатлівым, кволая Агрыпіна з цяжкасцю перавярнула яго на спіну. Толькі цяпер жанчына заўважыла на снезе невялікую лужынку чорнай крыві, якая тут жа застывала… Кабета замёрла на імгненне, не больш. Супакоіўшыся, зрабіла тое, што надумалася.

Доўгая, забітаму яна ніжэй каленяў, паддзёўка была з фабрычнага сукна, з адкладным каўняром. Але шылася не там, хутчэй — хатняй выпрацоўкі. Пад падкладкай хутчэй за ўсё, жанчына намацала, — кудзеля.

Дрыжачымі, зусім скалелымі рукамі, сэрца, здавалася, вось-вось выскачыць з яе грудзей, доўга расшпільвала два вялікія чорныя гузікі. Замест трэцяга, які, мабыць, нядаўна згубіўся, нябожчык прымацаваў кавалак дроту. З ім якраз і прыйшлося патузгацца, бо настылыя яе рукі ніяк не слухаліся. Нібы скамянелы, дрот ніяк не хацеў разгінацца.

Стаўшы на каленцы і схіліўшыся над целам нябожчыка, жанчына пачала хухкаць на дрот, а пасля старалася зноў і зноў яго разагнуць. Скрутак, нарэшце, ёй паддаўся. Агрыпіна з радасцю пазбавілася ненавіснай драціны і адкінула крысо паддзёўкі ўбок, а затым пакрысе ссунула адзін рукаў з тонкай рукі. Затым, напружыўшыся і з неверагоднымі высілкамі зноў пераварнуўшы мерцвяка, які хутка астываў, ужо лягчэй ссунула ўсю паддзёўку. Яшчэ прайшло некалькі хвілін — і цела немаладога мужчыны пад густым снегам стала нагадваць балотную купіну.

Задаволеная і шчаслівая Агрыпіна вярнулася да дзяцей».

Міша Кудзелька — 9-гадовы хлопчык — апынуўся ў нечалавечых умовах азарыцкага лагера разам са сваёй маці Матрунай, сястрычкай Кацярынкай. Прычым ужо спаўна зазнаў веннае гора. Яго родную вёску Беражанку гітлераўцы спалілі яшчэ ў лістападзе 1943 года: звыш 100 чалавек знішчылі ў канюшні. Хлопчык перажыў страту любімых дзядулі Антона, бабулі Волькі і бацькі — Васіль Кудзелька загінуў у партызанскім атрадзе Пятроўскага.

Праз вобраз Мішкі аўтар паказвае, як рана сталелі дзеці ў той час. Вясковы хлопчык тут, у канцлагеры, жыве клопатам сапраўднага гаспадара, адзінага прадстаўніка моцнай паловы сваёй сям'і. Ён марыць зрабіць будан з яловых ці сасновых галінак, назірае за ахоўнікамі, аналізуе: да каго з іх можна звярнуцца? Перыядычна Мішка марыць: каб можна было вярнуць мірнае жыццё, каб не было вайны! І гэтая наіўная, на першы погляд, дзіцячая мара — як зварот у ХХІ стагоддзе, калі ў розных кутках планеты ідуць бессэнсоўныя войны. Таму вельмі важны гэты «пасыл» 9-гадовага дзіцяці: «Эх, каб не было вайны!»

Заходзіцца ад болю сэрца, калі чытаеш раздзелы аповесці пра генацыд беларускага народа, пра тое, як гінулі ні ў чым не вінаватыя мірныя людзі нашай Беларусі: «…Ён плакаў ціха. Енчыў, нібы сляпое шчаня, толькі што адарванае ад цыцкі маці. Па худым тварыку яго цяклі і цяклі салёныя слёзы. І адначасова ў хлапечай душы вырастаў гнеў на гэтых звяроў-фашыстаў, што прыйшлі знішчаць яго — па праве — зямлю, яго сям'ю, яго суседзяў, за тое, што сагналі іх сюды, у гэтае балота… Не, ён, Мішка, ім ніколі не даруе. Ніколі! Не даруе гэтаму тоўстаму паліцаю, які ледзьве не застрэліў яго, дзіця, толькі за тое, што пасмеў падысці да калючкі і папрасіць галінак яліны… Не даруе ён і іхняму паскуду Гітлеру. Ён толькі выберацца адсюль, чакай, Гітлер!!! Калі ж не сам, то партызаны Пятроўскага абавязкова дабяруцца да твайго варожага логава і таксама спаляць цябе разам з тваімі, жонкай і ўсімі, хто табе блізкі, як спалілі па загадзе гэтага вырадка зямлі чалавечай майго дзеда і бабку…»

Чытаючы гэтыя радкі, асацыятыўна згадала кадры фільма Элема Клімава «Ідзі і глядзі», знятага па «Хатынскай аповесці» Алеся Адамовіча, калі галоўны герой-хлопчык страляе ў партрэт ненавіснага Гітлера…

Застаўшыся сіратою, Міхаіл Кудзелька падлеткам выхоўваўся ў інтэрнаце. Здолеў зберагчы, развіць найлепшыя свае чалавечыя якасці, хаця і стаў інвалідам дзяцінства: «Дужа вынослівы, жылісты, напрыклад, ён падцягваўся на турніку куды большую колькасць разоў нават адслужыўшых у войску аднакурснікаў. Яго, зразумела, не прызвалі з-за калецтва. І бегаць на дыстанцыі, зразумела, Кудзелька не мог. Аднак хворая нага не перашкаджала яму актыўна рухацца, абапіраючыся на кавеньку. Хадзіў ён і праўда досыць хутка, і не кожны нават здаровы мужчына мог за ім угнацца.

Працаўнік, годны кіраўнік Міхаіл Васільевіч Кудзелька — дырэктар адной са школ на Палессі. Шчыры, душэўны, сціплы, ён клапоціцца пра будаўніцтва новай школы. Гэты чалавек шчаслівы тым, што мае. Жаніўся ў свой час па каханні з любай Палінай, аднавяскоўкай па Беражанцы, якая таксама перажыла жахі другога азарыцкага лагера, не зведала шчасця мацярынства.

«Ён быў вельмі строгім, але справядлівым настаўнікам і дырэктарам. А гонкая, як рабінка, чарнавалосая прыгажуня Паліна Пятроўна, яго жонка — настаўніца пачатковых класаў — сама дабрыня. Толькі мала ёй было адведзена пражыць. Першыя гады іх сямейнага жыцця ўсё складвалася добра. Але потым Паліна Пятроўна захварэла, і ўрачы не маглі справіцца з яе рэдкім захворваннем. Памерла яна зусім рана, не дажыла і да пяцідзесяці, пакінуўшы нязгоднага мужа аднаго. Для Кудзелькі гэта было не проста гора…»

***Чытачы старэйшага пакалення, безумоўна, узнаўляюць у памяці хранікальна-дакументальныя кадры тэлебачання пра азарыцкую трагедыю, у якой пацярпелі каля 50 тысяч чалавек. Чытач аповесці У. Гаўрыловіча скурай адчувае той пранізлівы холад, неймаверны голад, лютасць гітлераўцаў і іх памагатых. І разам з тым — ахвярнасць маці, якія аддаюць апошняе, каб толькі ўратаваць дзяцей.***

Можна канстатаваць, што ў вобразе Міхаіла Кудзелькі-дарослага аўтар выводзіць найлепшага прадстаўніка грамадства, патрыёта сваёй Бацькаўшчыны, выдатнага педагога, які даў пуцёўку ў жыццё не аднаму пакаленню моладзі. Гэты чалавек ніколі не спекуляваў на тым, што ён былы вязень Азарычаў. Гэты сумленны чалавек перажыў інфаркт: пасварыўся, сказаў горкую, але праўду, маладаесведчанаму інспектару з рана, таму і быў спісаны на пенсію.

Уладзімір Гаўрыловіч удала зводзіць у сваёй аповесці мінулае і сучаснае, дзяцінства і залаты век галоўнага героя. Таму літаратурны твор можна рэкамендаваць і дзяцям сярэдняга ўзросту, і дарослай аўдыторыі, і для сямейнага чытання.

Чытач даведваецца, што і раней, і цяпер, у 20-я гады ХХІ стагоддзя, ветэран педагагічнай працы 90-гадовы Міхаіл Кудзелька ніколі не сядзеў на лаўцы каля дома, а быў у гушчы ветэранскага жыцця, ініцыіраваў стварэнне школьнага музея, арганізоўваў вечары — ушанаванні педагогаў-ветэранаў…

Міхаіл Кудзелька не замыкаецца ў сабе, падтрымлівае даўнія шчырыя стасункі з суседзямі Бялько. Не забываюць яго і былыя вучні. Аўтар міжволі падводзіць нас да асэнсавання сучаснага жыцця, паказваючы, што нават харошыя суседзі паглыблены ў жыццё адзін аднаго толькі на бытавым узроўні, занятыя сваімі паўсядзённымі праблемамі. Вось і малады сусед Кудзелькі, настаўнік Мікола Бялько, выпадкова даведваецца, што сусед, Міхаіл Васільевіч, былы вязень Азарычаў.

Жонка маладога настаўніка даверае 90-гадоваму суседу сваіх дзетак — 12-гадовага Мікітку і малодшую Міланку. Зварот «дзедзік Міша» падкрэслівае, як любяць старога малыя: ім вельмі цікава з ім. Дыялог Міхаіла Васільевіча з Мікіткам пра характары вятроў, што стары напаткаў за доўгае жыццё, у тым ліку і ў лагеры смерці Азарычы, упэўнівае: ёсць і сонечны вецер, якога так чакаў 9-гадовы Міша Кудзелька. Як казачна-паэтычны аповед гучыць гэты дыялог:

«— Можа, і не паверыш мне, Мікітка… Але… Розны вецер бывае на свеце. Я многа пражыў, ведаю дакладна. Асабліва шмат іх ведаеш у каго? У паэтаў. А сонечны з іх, як мне здаецца, — самы галоўны…

— Ну, ты смяешся з мяне, дзед Міша? Я ж ужо вялікі…

— А ты паслухай, паслухай… Некалі, даўно-даўно, калі быў значна меншы за цябе, я так яго, гэты сонечны ветрык, чакаў ранняй вясной у госці, так чакаў. А ён так і не з'явіўся. Затое нібы здзекаваліся з мяне злосныя і жорсткія, пранізліва-калючыя, студзёныя, сырыя, ледзяныя, нібы іх з дому нехта выгнаў і ў адным месцы сабраў разам, беспрытульныя вятры… Але ён ёсць, сонечны вецер. Ты, Мікітка, часта з ім сустракаешся, толькі, мабыць, і не заўважаеш. Бо ён прыемны табе. А вось халодны, зябкі, непрыветны вецер, як сёння, ты ж з ім сёння вочы ў вочы пабачыўся, ён прабівае да дрыжыкаў. Табе становіцца холадна і ты ўпэўнены, што ён, шкоднік, ёсць. Гэтаксама ёсць і сонечны, толькі ён сапраўды цёплы, гаючы…»

Міхаіл Васільевіч у свой час фактычна выратаваў жыццё Мікітку: хворае сэрца дзіцяці прааперыравалі ў сталіцы дзякуючы былым вучням настаўніка Кудзелькі — тыя знайшлі прафесара, які рызыкнуў. Я як чытач-жанчына, маці, бабуля эмацыянальна ўспрыняла рашэнне галоўнага героя расказаць 12-гадоваму Мікітку пра Азарычы: усё-ткі гэтае дзіця перанесла аперацыю на сэрцы. У той жа час пісьменнік Уладзімір Гаўрыловіч як бы заінтрыгаваў: якім будзе гэты аповед пра перажытыя жахі, як падасць яго аўтар? Супакойвала тое, што галоўны герой аповесці ў 9-гадовым узросце перажыў трагедыю, а Мікітка ўсё ж на тры гады старэйшы. Яшчэ мне міжволі згадалася сказанае народным пісьменнікам Беларусі Іванам Шамякіным, які адзначаў, што пакаленне ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, вярнуўшыся дамоў пасля Перамогі над фашызмам, вельмі ўжо беражліва-клапатліва ставілася да нашчадкаў, імкнуліся нічым іх не растрывожыць, залішне апякаваць. І гэта дало не лепшы вынік...

Уладзімір Гаўрыловіч ад імя свайго галоўнага героя педагагічна тонка вядзе дыялог з Мікіткам пра перажытае ў азарыцкім лагеры:

«— Ты вось пытаўся: ці страшна мне было? Так, мне было страшна, унучак. Вельмі страшна… Нават цяпер пра гэта расказваць — сэрца не вытрымлівае. Баліць дагэтуль. У цябе ёсць сёння тата і мама, бабуля, сястрычка. Калі ж мне споўнілася дзевяць гадоў, Мікітка, я застаўся круглым сіратой. Ворагі, якія прыйшлі нас заваяваць, расстралялі маіх дзеда і бабу, раней яшчэ загінуў тата, ён быў партызанам…»

Бясспрэчна: аповесць Уладзіміра Гаўрыловіча «Пад покрывам нябёсаў» — магутны антываенны твор, скіраваны на патрыятызм, гуманізм, чалавечае ў чалавеку.

Тамара КРУЧЭНКА

# Столькі радасці з магнітафонам

**Далёка не кожны «дарослы» паэт піша для дзяцей. Пры гэтым нават калі і бярэцца за новую для сябе справу, не заўсёды дасягае ранейшага поспеху. Кастусь Жук — прыемнае выключэнне. Выдаўшы ў 1988 годзе сваю першую кнігу «Зямная ноша», ён добра зарэкамендаваў сябе і наступнымі зборнікамі «Пладаносны агонь» (1991), «У найме сонца» (1992), «Галгофа» (1997). Аднак вырашыў і для хлопчыкаў і дзяўчынак пісаць, аб чым засведчылі яго кнігі вершаў, казак, скорагаворак і загадак «Шпак купіў магнітафон» (1996), а таксама «Бегемот без ботаў» (2004). Магчыма, калі б больш пражыў — не стала яго 25 лютага 2023 года на 69-м годзе жыцця, — з'явіліся б і новыя. Той жа персанаж шпак мог бы стаць яшчэ больш сучасным. Зацікавіўся б, скажам, камп'ютарам ці прыдбаў бы мабільнік.**




Аднак, аказваецца, і з магніфонам ён адчувае сябе па-ранейшаму так, што і сам яму радуецца, і іншым даводзіць, якая гэтая вартая прылада, калі хочаш запісаць, а пасля паслухаць музыку. У гэтым паспелі ўпэўніцца ўжо ўсе, хто набыў кнігу «Шпак купіў магнітафон». Другое жыццё ёй даў Выдавецкі дом «Звязда». Яна толькі што выйшла, а ахвотных набыць яе з'явілася шмат. Найперш сённяшнія бацькі, а то і бабулі, дзядулі, якія памятаюць першае выданне — яго некалі выпусціла тагачаснае выдавецтва «Юнацтва». Асобныя творы не забыліся, то чаму б не парадаваць імі сваіх дзетак?! Найперш вершам, які і даў назву кнізе:

*Мне прысніўся дзіўны сон –*
*Шпак купіў магніфон.*
*Ён, усеўшыся на грушу,*
*Інтэрв'ю бярэ ў птушак.*

З салаўём шпак размаўляе, з вераб'ём, з удодам… А пасля… «Шчоўкнуў шпак магнітафонам — // І азваўся сад зялёны // Галасамі вераб'я, // Амялушкі, салаўя… Нават жаваранак з неба // Звонка падцягнуў, як трэба. // Аж пусціліся ў скокі // Тры сініцы, дзве сарокі». Такое шматгалоссе адбылося, што стала «вольна ўсім тут галасам». Ад таго, што сам «сад звінеў», хлапчук прачнуўся. І даведаўся: гэта яму не прыснілася, шпак сапраўды купіў магнітафон!

Кастусь Жук, як відаць па гэтай кніжцы, а таксама і па «Бегемоце без ботаў», ды і па публікацыях у перыёдыцы (шкада, што выступаў нячаста), добра адчуваў дзіцячую псіхалогію. Навукі, як лепш зразумець яе, вядома, няма. Але для гэтага неабходна не так і шмат, аднак разам з тым і многа. Каб была належная творчая інтуіцыя. Адкуль яна бярэцца — нікому не вядома. Ды ці яна ёсць, ці яе няма. У Кастуся Жука была належная, якая не кожнаму даецца.

Чытаеш вершы «Кот па клічцы Бегемот», «Алежка», «Халодная вада», «Дзядзька Дождж» , «Аленка і каленкі» — спіс можна доўжыць, і тое, пра што апавядаецца, пераконвае, як трэба пісаць для дзяцей, каб гэта было ярка, запамінальна, каб праз напісанае яны далучаліся да самога жыцця. Свайго і жыцця дарослых. Часам першае ненавязліва пераходзіць у наступнае, як у вершы «Я вяду на луг казу»:

*Я вяду на луг казу*
*Барадатую.*
*Навяжу за лазу*
*Там, за хатаю.*

*Хай пасецца пад кустом*
*Разам з ветрыкам.*
*Пачастуе малачком*
*Мяне вечарам.*

Ёсць у кніжцы і вершы, у якіх паэт па-свойму расказвае пра характва роднай прыроды, яе насельнікаў. Напісаны яны так, што дзеткам добра запамінаюцца. Бо маюць пазнавальны змест, а яшчэ, што таксама важна, напісаны са спагадай да раслiннага і жывёльнага свету, з думкай: што б ні акружала нас, гэта — частка ўсяго жывога, і да яго трэба ставіцца беражліва: вершы «Кажан», «Што майструе ў лесе дзяцел?», «Чмельласун», «Незвычайны цымбаліст»… Прачытаўшы ж «Снежань», ад дарослых хлопчыкі і дзяўчынкі могуць даведацца, якімі раней былі зімы:

*У бялюткім кажушку*
*Крочыць Снежань па лужку.*
*У цудоўным ён настроі,*
*Бо за ім — сняжынкі роем.*
*Ён для цётухны Зімы*
*Шлях праторвае прамы.*

Верш жа «Май» цікавы тым, што гэтае слова ў тэксце абыгрываецца ў розных значэннях. Гэта, безумоўна, пашырае веданне дзецьмі роднай мовы: «Каля школы — // Гам вясёлы, // Май // Збірае ў кола: // Ён пазваў // На перапынак // З класаў // Хлопчыкаў, дзяўчынак, // Промнямі // Іх атуліў, // Смехам звонкім // Надзяліў // і Вітае // Несупынна // Светлым // Пошчакам птушыным… // Радуецца Мая // Маю, // Што сяброў // Багата мае».

Калі ж кнігу Кастуся Жука «Шпак купіў магнітафон» для дзяцей дома маеш, таксама можаш парадавацца. Не толькі ў маі, а ў любым месяцы. Настолькі дасціпная, да чытання так і просіцца. То чаму б не абрадаваць малых такім падарункам?!

**Еўдакім ДРОМІН**

# Характва простых людзей

**У выдавецтве «Беларусь» выйшла новая кніга ў серыі «Кніжная паліца школьніка». У «Зборнік твораў для дадатковага чытання ў 10 класе» ўключаны раман класіка беларускай літаратуры Кузьмы Чорнага «Зямля», напісаны яшчэ ў 1928 годзе, і санеты Уільяма Шэкспіра, перакладзеныя Уладзімірам Дубоўкам.**




З выдавецкай анатацыі да кнігі: «У цэнтры ўвагі твора К. Чорнага няпростае жыццё беларускай вёскі пачатку 1920-х гадоў "на зломе эпох", духоўныя пошукі герояў. У перакладах санетаў У. Дубоўка раскрыў маляўнічыя ўласцівасці роднай мовы, пры гэтым імкнуўся, каб вялікая паэзія арыгінала не згубіла пластычнасць вобразаў, музыкальнасці фразы і філасофскай паглыбленасці. Зборнік выдаецца ў межах праграмы, зацверджанай Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, і прызначаны для адукацыйных мэт».

Кузьма Чорны прыйшоў у беларускую літаратуру ў самым пачатку 1920-х гадоў. Спярша выступаў як паэт. У 1921 годзе надрукаваў першыя свае празаічныя творы. Лічыў пачаткам сапраўднай творчай дзейнасці публікацыю апавядання «На граніцы», якое ў 1923 годзе было надрукавана пад псеўданімам К. Чорны. Першыя кнігі прозы выйшлі ў 1925 годзе — «Апавяданні» і «Срэбра жыцця». Раман «Зямля», эпіграфам да якога з'яўляюцца паэтычныя радкі Язэпа Пушчы: «Ў прасторы зоры лушчаць // Сузор'ҽў срэбра-стынь. // Лясы, дубровы, пушчы // Вартуюць нашу сінь», пабачыў свет у 1928 годзе. У творы — аповед пра «характва простых людзей». Раман паказальны для ўсёй творчасці Кузьмы Чорнага, які імкнуўся разабрацца ў разнастайнасці поглядаў на асобу чалавека, які імкнуўся ўзвышаць людзей, нягледзячы на розныя складанасці сацыяльнага, грамадска-палітычнага жыцця.

Уладзімір Дубоўка выдаў асобнай кнігай пераклады санетаў Уільяма Шэкспіра яшчэ ў 1964 годзе. З таго часу, праз многія дзесяцігоддзі, не зважаючы на тое, што да творчасці класіка сусветнай літаратуры звярталіся многія беларускія паэты-перакладчыкі, перастварэнні У. Дубоўкі лічацца найлепшымі. «Краса ніколі не памрэ на свеце — // Тварэнні дзіўныя прыносяць плён. // Пялёсткі вянуць на ружовым цвеце, // Ды аднаўляе памяць іх бутон», — сцвярджае следам за Шэкспірам Уладзімір Дубоўка.

Тыраж «Зборніка твораў для дадатковага чытання ў 10 класе» — 1000 экзэмпляраў. Несумненна, кніга спатрэбіцца і вучням, і настаўнікам, ды і ўвогуле шырокаму колу чытачоў, якія любяць беларускае мастацкае слова.

**Мікола БЕРЛЕЖ**



Чытацкі дзённік Навума Гальпяровіча

# Чароўных слоў руплівы гаспадар

Усё найлепшае, створанае ў беларускай паэзіі за многія гады, немагчыма ўявіць без многіх радкоў Рыгора Барадуліна.

Яго найлепшыя вершы сталі сапраўды хрэстаматыйнымі, а некаторыя ператварыліся нават у крылатыя выразы: напрыклад, «Трэба дома бываць часцей…»

Ён зрабіў сваю маму Куліну і родныя Ушачы сімваламі сыноўняй любові і адданасці.

Ён стварыў лірычны гімн каханню і шчырасці.

І часам, калі хочацца акунуцца ў свет цудоўнага і багатага беларускага слова, я адкрываю адзін з яго зборнікаў (а іх у мяне шмат) і перачытваю знаёмыя радкі:

*Паэзія — хвароба ўсіх вякоў.*
*Паэзія — служанка й каралева.*
*Лірычных слёз рашучая залева*
*Астудзіць стому босых ступакоў.*
*Сцяжыны ўмуражэлыя радкоў*
*Бягуць пад засень ранішняга дрэва,*
*Дзе яблык падала Адаму Ева,*
*Дзе спяць сляды пегасавых падкоў.*

Словы ў паэта, нібы залацінкі, прасвечваюць не толькі паперу, на якой былі напісаны, але і ўсю паэтычную прастору. А вось, дарэчы, якую карціну стварае Барадулін з маёй полацкай станцыі Грамы:

*Паравоз сапе і цяжка дыхае*
*На завейнай станцыі Грамы.*
*Ходзяць маразы хадою ціхаю*
*Белымі пуцейцамі зімы.*

*Кажухі пуцейцам лінзай сонечнай*
*Сакавік у поўдзень прапячэ, —*
*Па тугіх, настылых рэйках звонячы,*
*Паімчацца цягнікі шпарчэй.*

Шмат разоў я праходзіў і праязджаў міма гэтай станцыі, і ў галаве круціліся гэтыя радкі.

Увогуле, Барадулін — майстар зрабіць са звычайнага, падгледжанага сапраўдны паэтычны шэдэўр:

*Ішла над ціхім лесам поўня.*
*Расы чакалі верасы.*
*Пад вербамі ў нагрэтым чоўне*
*Дзяўчына мыла валасы.*

*Яшчэ худзенькімі рукамі*
*Вязала, мокрыя, вузлом.*
*Усмешка на вадзе блукала.*
*Хмурынкі возера вязло…*

І аблачыны, хмары, дождж, вецер у яго становяцца жывымі істотамі, жаданымі суразмоўцамі:

*Рэха бяру ў далоні*
*Радасцю блаславіцца.*
*Мне пазваніла сёння*
*Рыжая бліскавіца.*

Барадулінская паэзія не патрабуе тлумачэння, яна сама адказвае на ўсе пытанні пра вытокі творчага метаду, паэтычных высілкаў майстра. Віртуознае валоданне словам, знешняя лёгкасць і прастата, за якімі стаяць магутны прыродны талент, робяць яго вершы празрыстымі, нібы само дыханне, і хочацца цытаваць іх бясконца. Я ўжо не бяру знаёмыя многім аматарам барадулінскія радкі, якія сведчаць пра яго магутную чароўную здольнасць ператвараць роднае слова ў залатую пярліну. Ён у адным са сваіх вершаў назваўся «роднага слова прыгонным». Але творы выстаўляюць яго не толькі «прыгонным», а дбайным гаспадаром і руплiўцам гэтага слова. Такім ён і ёсць у нашай літаратуры.



## Іван КАПЫЛОВІЧ

* * *

Дарма шукаць зямнога раю
У неспакоі тлумных дзён.
Сябе я вечна дакараю —
Не так, не тое выбіраю:
Стыхіі трапіў у палон.

Сабе агледжуся наўкруга
І пашкадую аб адным:
Сумлення голас мала слухаў,
Таму і мала маю зрухаў —
Іх прысвяціў бы дням сваім.

Калі адыдзе час ваганняў
Парою смутку і нуды,
Надыдзе час перакананняў
Парой бязвоблачных світанняў,
То добра ўбачу ўсці куды.

Я зледжу цупкую дарогу
І не на дзень, і не на два.
Яна ад роднага парога
І да людзей вядзе, да Бога:
Жывуць чым сэрца, галава.

* * *

Мне з морам развітанне —
Няпростыя хвіліны:
За даллю ўбачу сіняй
З ім новае спатканне.

Пачую шум прыбою
І лёгкі плёскат хваляў
Адтуль, з нябачных даляў,
Сам-насам дзе з сабою.

Распраўлю мрояў крылы
І зноў убачу бераг,
Дзе гасцяваў і верыў —
Са мной край жураўліны.

Яны са мной навечна —
Палессе й Чорна мора.
Са мной яны гавораць
Са шчырасцю сардэчнай.

* * *

Я рос каля гэтых палян,
Дзе верас, грыбы і туман.
Куды ні пайду і ні гляну —
Тут руніўся час недарма.

Канешне, не ў аднача́ссе
Выходзіў народ на святло.
Сваё здабываючы шчасце,
Здаралася ўсё тут, было.

Ды неяк паціху, памалу
Упэўнена ўсе йшлі туды,
Вясна дзе на ногі ўставала
І дзе зацвіталі сады.

Яна і мяне тут заспела
І шчыра мне глянула ў вочы,
Спытала раптоўна і смела —
Што люд ад яе сёння хоча?

Іскрыстай, спагаднае ласкі,
Што цешыць душу,
цешыць вока?
Здзяйснення нязбытнае казкі,
З часоў што прыходзіць далёкіх?

* * *

З майстэрні добра бачыць ён
Святло, адценні часу.
За ім ідуць яны спакон,
Між кожны побач, разам.

Зірне ў адкрытае акно:
Сярэдзіна ўжо лета.
Палессе кліча кожным днём
Пісаць яго сюжэты.

Там, на Палессі, убачыць ён
Вясёлку, што над лугам.
І летніх росаў перазвон
Ён з заміраннем слухаў.

Там, на Палессі, творчы дух
Ніколькі не згасае,
І чарадзейны свет задум
Палоніць, акружае.

* * *

Не пазнаю старой дарогі,
Я па якой спяшаў на шлях
І раскавана думаў, мроіў
На час бліжэйшы планы строіў
Пад пошум лесу, песні птах.

Я забываў пра ўсё на свеце —
Ішоў па сонцы наўздагад.
Бяроз няколвых бачыў веце,
І падалося —
ўдача свеціць
І далей будзе ва ўсім лад.

Дарога бачыла і знала,
Як падымаўся я і рос,
На свой выходзіла прагалак,
Дзе тое дні мае натхняла,
Што я расту ў краі бяроз.

Я перадумаю нямала,
Йдучы праз брод, праз верасы.
Дарога думак строй мяняла
І паступова адкрывала
Мой шлях у іншыя часы.



## Валерый КУХАРЧУК

* * *

Туман такі!
Зямля што ў дыме.
Дзе ж вы, мае беразнякі?
Дзе з-пад сусальнага кіліма
на паказ мкнуцца краснюкі.

У волкім лазняку абабкі
распачынаюць карагод.
Апенькі вытыркаюць шляпкі
навыперадкі: хто каго.

Клубы ў лажках. Зямля паруе.
На горным схіле — малако.
Вурчыць матор. І я шыбую
з вядзерцам — лесу на паклон.

* * *

У небе начным — святлафор:
чырвоны агеньчык, зялёны...
Між бляклых, запыленых зор
ён — веснікам душ акрылёных.

Там, мажа, ужо спяць лятакі
і аўтапілот правіць лёсам...
Там мар і надзей клубкі,
растанняў з сустрэчамі плёсы.

І бачны наўкола здаля
сігналы, нібы бліскавіцы,
каб не забывала зямля,
каб светлым спатканням адбыцца.

* * *

Раптоўны лівень, нечаканы.
Сіноптык, пэўна што, праспаў.
Вада нахлынула, як з крана,
наўхіст прыкметам, без падстаў.

Рабіць што?
Зрушыліся планы.
Дзе ратавальнае крысо?
Вердыкт выносіцца спантанны:
балоння, боты, парасон.

Цурчаць рачулкі па асфальце,
пад ветрам правяць баль лісты.
Да восені ў зіхоткай смальце
прадзімак выбраўся ў сваты.

* * *

Што будуць грады, снегапады,
ад ураганаў стане цесна,
і не знайсці нідзе спагады —
камета на хвасце прынесла.

Што будуць палы, перапалы,
зямля замесіцца, як цеста,
не ўратавацца ад навалы —
камета на хвасце прынесла.

Няўжо ж то космас крыважэрны
ліхую долю нам прарочыць?
...Здае экзамены экстэрнам
планеты кватарант сірочы.

* * *

Пахне сенам, а сена няма.
Змалаціла, пасекла травінкі,
растрындыкваючы задарма,
фанабэрыстая машынка.

А карміцца каму? Далібог,
правіць урбанізацыя дбайна.
Прапісаўся ў газоны мурог,
стаў, як кажуць,
ландшафтным дызайнам.

Мне б васьмёрку — дзядулі касу —
ды ў пакос залавеючым ранкам.
Як бурштынавы россып — расу —
ды гладыш сырадою на ганку.

Пахне сенам, а сена няма...



## Дар'я ДАРОШКА

### Бібліятэка

Кожны ранак прачынаемся —
Новай кнігай пачынаемся.
І чытае ў кнізе Бог,
Хто нам сёння дапамог,
Хто пакрыўдзіў, хто зняважыў.
Кожны крок у кнізе важны,
Кожная старонка, слова —
Значна ўсё і нават мова.
Дзень праходзіць, і чытач
Кажа сам сабе: «Дабранач!»,
Ставіць кнігу на паліцу,
Каб нам — новай нарадзіцца...

Раніцою прачынаемся —
Новай кнігай пачынаемся.
І чытае ў душах Бог,
Колькі хто прайшоў дарог;
Хто занадта гора ўбачыў...
І чытае Бог, і плача.
А бывае, што рагоча,
Калі лёс па сонцы крочыць,
Калі шчасце на старонках,
Унутры душы і звонку.
Усміхаецца, святлее,
Сам блукае па алеі...
І чытае аж да ночы,
Бышцам побач з намі крочыць.

Новы ранак пачынаецца —
Іншай кнігай прачынаемся...

### Трапнасць

Хвалі жыцця разыходзяцца жвава,
Ледзьве хто-небудзь нырне ў існаванне —
Кінецца ў лужыну, возера, мора:
Кожнаму рознае водная чэрава.
Увасабляемся без разумення,
Без усвядомленага адчування.
Скокнулі-стрэльнулі, як адкаloліся
З неба аскепкам святла бліскавічнага —
І нарадзіліся. Хтось — чалавекам:
Гэта з агнёў, што пападалі ў мора.
Хтосьці — з душою пачвары ці цмока:
Гэта ўжо тыя,
што ў лужыны скокнулі.

### Надзея

Нашто мяне ты ў лютым нарадзіла,
Мая матуля? Люты — гэта лёс!
Усё жыццё мне бракавала сіл
Перамагчы наканавання моц.
На лёдзе рыбай б'юся — свет смяецца!
Маўчанне рыбы —
гэта немы стогн!
Ніхто не верыць, што слязьмі ліецца
З вачэй сасленлых сонечны агонь.

Нашто мяне ты ў лютым нарадзіла?
На мех пакут,
няспраўджаных надзей!
І ўсё ж такі...
А можа, раптам — дзіва?
А можа, яшчэ будзе светлы дзень?



Фота Кастуся Дробава.

# Знічкі вечнасці

*Мініяцюры*



**Уладзімір МАЗГО**

## Гісторыя з аўтографам

Мы працавалі разам з Уладзімірам Машковым. Не з народным артыстам, а з вядомым пісьменнікам. Уладзімір Георгіевіч якраз узначальваў рэдакцыю ў выдавецтве «Юнацтва», калі я прыйшоў туды на пасаду літаратурнага рэдактара.

Уважліва змераўшы мяне сваім добразычлівым позіркам, шэф прамовіў:

— Майце на ўвазе, дагэтуль за вашым рабочым сталом працаваў класік дзіцячай літаратуры Артур Вольскі. Вам аказаны вялікі давер, які трэба яшчэ апраўдаць.

І я кожны працоўны дзень стараўся апраўдаць гэты давер. Ну, вядома, з дапамогаю Уладзіміра Машкова, які шчодра дзяліўся са мной сакрэтамі выдавецкай справы.

Мой цёзка быў светлым цудоўным чалавекам і таленавітым пісьменнікам, аўтарам многіх захапляльных кніг для дзяцей, сцэнарыяў дакументальных фільмаў, перакладаў на рускую мову твораў беларускіх празаікаў.

Аднойчы, калі ў яго выйшла новае дзіцячае выданне, ён завітаў у нашу рэдакцыю і звярнуўся да мяне:

— Здаецца, вашага сына завуць Андрэй?

— Так! — адказаў я.

Уладзімір Машкоў таямніча ўсміхнуўся, дастаў з шыкоўнага скуранога партфеля сваю новую кнігу і падпісаў яе так: «Андрэю — спадчыннаму прынцу сям'і Мазго»…

А на вокладцы красавалася адпаведная назва: «Спадчынны прынц Андрэйка» («Наследный принц Андрюша»). Аўтограф, што называецца, быў да месца.

## «Усё будзе добра!»

Упершыню мы сустрэліся з ім на старонках газеты «Піянер Беларусі» ў верасні 1973 года. Тагачасны школьнік, я дэбютаваў тут з вершам «Спрачаюцца маланкі». А ў гэтым жа нумары быў надрукаваны журналісцкі матэрыял супрацоўніка рэдакцыі Міхася Зарэмбы.

Мабыць, тады я нават яшчэ не здагадваўся, што праз нейкі час буду працаваць разам з Міхасём Мікалаевічам у адной рэдакцыі ў выдавецтве «Юнацтва».

А ў 1989 годзе дырэктар «Юнацтва» Валянцін Лукша прадставіў нам новага загадчыка рэдакцыі літаратуры для малодшага школьнага ўзросту. І тут мне адразу згадалася наша колішняе суседства з Міхасём Зарэмбам на старонках «Піянера Беларусі».

Праца ў выдавецтве зблізіла нас, пасябравалі на доўгія гады. Шчыры і добразычлівы чалавек, таленавіты дзіцячы пісьменнік, ён быў надзейным сябрам у жыцці. Зарэмба перадаваў нам сваё журналісцкае майстэрства і паспяхова пераймаў наш выдавецкі вопыт. І ў будні, і ў святы мы былі з ім заўсёды разам.

Калі Міхась Мікалаевіч цяжка захварэў, мы з Алесем Камароўскім і Ганадам Чарказянам наведалі яго ў бальніцы ў Бараўлянах. З сумнай і горкай усмешкай на твары ён супакойваў нас: «Хлопцы, не хвалюйцеся. Усё будзе добра!..»

У хуткім часе Міхась Зарэмба адышоў у вечнасць. А яго душэўная цеплыня і непагасны аптымізм запомніліся мне назаўсёды.

## Ад Зэльвы да Кітая

Кожны год у лютым ва ўсім свеце адзначаецца Міжнародны дзень роднай мовы.

Іду я пасля працы да станцыі метро «Плошча Перамогі», а насустрач — літаратуразнаўца, доктар філалагічных навук, прафесар Іван Саверчанка.

— Прывітанне! Ці ведаеш, Валодзя, што пасол Кітая чытаў твой верш на ўрачыстай імпрэзе ў Мінскай ратушы?.. — запытаў Іван Васільевіч.

Гэтая навіна мяне вельмі зацікавіла. І дома я пачаў шукаць пацвярджэнне пачутаму ў інтэрнэце.

І, што вы думаеце, не толькі знайшоў, а нават паглядзеў на відэа, як тагачасны Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Беларусі Се Сяаюн узнёсла і натхнёна чытаў мой верш «Сакавіны» на сакавітай беларускай мове:

*Штогод*
*У родныя мясціны*
*Прыходзіць свята —*
*Сакавіны.*
*Зямлі заспанай*
*Абуджэнне,*
*Вясны жаданай*
*Нараджэнне.*
*Пад небам,*
*Светлым і высокім,*
*Абсяг прапах*
*Вясновым сокам,*
*Дзе радасць*
*Вершамі разліта*
*На роднай мове*
*Сакавітай.*



Фота Кастуся Дробава.

А сэрца ў гэты міг напаўнялася невыказным гонарам за родную Беларусь і за маю малую радзіму Зэльву, дзе ўжо болей за чвэрць стагоддзя ладзіцца свята паэзіі і музыкі «Сакавіны», пра якое сягоння даведаліся і ў далёкім Кітаі.

## Як першая ластаўка

Я пасябраваў з песняй даволі рана, яшчэ ў маленстве. Мая мама Ганна Рыгораўна часта напявала мне ў залежнасці ад настрою то лірычныя, то жартоўныя канцоны.

Мы слухалі вечарамі з бярэжкаўскімі хлопцамі ў кінабудцы вясковага клуба новыя эстрадныя запісы ўсесаюзнай фірмы «Мелодыя». Няспынна кружыліся музычныя дыскі, а разам з імі кружыліся, здаваліся, і нашы галовы. Амаль як у песні на словы Роберта Раждзественскага: «Какие старые слова! А как кружится голова, а как кружится голова!»

У час вучобы ў Зэльвенскай сярэдняй школе да мяне падышоў дзесяцікласнік Гарык Калеснікаў, які ўваходзіў у маладзёжны састаў вакальна-інструментальнага ансамбля «Русічы» раённага Дома культуры.

— Чытаў твае вершы ў друку. Яны мяне кранулі сваім лірызмам. Напішы, калі ласка, словы для нас, а я пашукаю мелодыю. Магчыма, нешта атрымаецца.

І я напісаў тры песенныя тэксты. Праўда, трэці верш вырашыў нікому не паказваць. У мяне ўзнікла сумненне наконт яго залішняй сентыментальнасці. У ім былі наступныя радкі: «Я лицом ловлю дождь твоих волос. Я тебя люблю, милая, до слёз».

А вось вядомы расійскі спявак Аляксандр Сяроў аніякай сентыментальнасці не пабаяўся, у яго песні я пачуў нашмат пазней падобныя словы: «Я люблю тебя до слёз»…

Праз некалькі дзён Гарык запрасіў мяне ў Дом культуры на рэпетыцыю ансамбля. Калі я ўвайшоў у вестыбюль, хлопцы зайгралі. Загучала пакуль незнаёмая мне музыка, але якую я, здаецца, недзе ўжо чуў. Магчыма, у сне.

Калі ж прагучалі першыя словы, мне стала ўсё зразумела. Так нараджалася наша першая песня. Яна прыляцела да нас на крылах мелодыі, як першая ластаўка, — і на душы адразу стала цёпла і сонечна, як сапраўднаю вясной.

## Жывое слова

З трапяткім хваляваннем бяру ў рукі аднатомнік выбраных літаратурна-крытычных артыкулаў Уладзіміра Юрэвіча «Абрысы» і разгортваю на тытульнай старонцы. Позірк прыцягвае сціслы, надзіва шчыры і добразычлівы надпіс: «Уладзіміру Мазго — пераможцу конкурсу радыёклуба "Жывое слова" з пажаданнем шчасця на самастойнай дарозе. Чэрвень 1976 г. Уладзімір Юрэвіч».

Божа, як гэта было даўно!.. Палова стагоддзя амаль прамінула. А памяць ізноў высвечвае з далечы часу радасны твар школьніка-выпускніка, узнагароджанага кнігамі з аўтографамі Уладзіміра Юрэвіча, Янкі Брыля, Рыгора Барадуліна, Сяргея Грахоўскага.

Менавіта з «Жывога слова» пачалося маё знаёмства з творчасцю Уладзіміра Міхайлавіча Юрэвіча, пісьменніка і нязменнага старшыні дзіцячага радыёклуба. А гучала «Жывое слова» ў рэспубліканскім эфіры, пачынаючы з 1963 года. І ўвесь гэты час беларускія школьнікі мелі для сябе цудоўную магчымасць, кажучы словамі самога Юрэвіча, пашыраць і паглыбляць веданне роднай мовы, асабліва тых яе пластоў, што застаюцца па-за школьным урокам і падручнікам.

Пісалі Юрэвічу не толькі школьнікі, але і дарослыя. Здаралася нават так, што бацькі як эстафету перадавалі сваім дзецям сяброўства з радыёклубам. Цяжка ўявіць, як ва Уладзіміра Міхайлавіча хапала часу на знаёмства з усімі даслаными лістамі. Рэгулярна раз на месяц радыёслухачы атрымлівалі грунтоўныя адказы на пытанні аб паходжанні імёнаў, прозвішчаў, геаграфічных назваў.

Даволі часта праводзіліся і літаратурныя конкурсы, дзе свае крылы развіналі юныя паэты, празаікі, журналісты. Разам з імі актыўны ўдзел у радыёклубе прымаў і я, нават быў пераможцам многіх конкурсаў.

На багатым матэрыяле гэтых змястоўных радыёперадач Уладзімір Юрэвіч стварыў навукова-папулярную кнігу «Слова жывое, роднае, гаваркое…», якая ў 1992 годзе пабачыла свет у выдавецтве «Юнацтва» і была адзначана Дзяржаўнай прэміяй Рэспублікі Беларусь.

Апантаны мовазнаўца і патомны інтэлігент, ён заўсёды карыстаўся павагай і аўтарытэтам як у старэйшых, так і ў маладых калег па пяры. Да яго важкага слова прыслухоўваліся і іншыя.

І як пацвярджэнне гэтаму — згадка вядомага паэта Алеся Пісьмянкова ў кнізе «Думаць вершы…»: «Некалі, працуючы ў Саюзе пісьменнікаў, сядзеў у адным кабінеце з Уладзімірам Юрэвічам, які асабіста ведаў Купалу, вельмі цікава расказваў. Спачатку не прыдаваў гэтаму значэння, а потым падумаў: дзе ж яшчэ знайду такое багацце? Пачаў запісваць».

Я таксама пасля не раз шкадаваў, што не занатоўваў на паперы ўражанні ад цікавых сустрэч, не вёў дзённікаў. Бо многае з бегам часу, на вялікі жаль, забываецца. Але, напэўна, не забудзецца тое, што пакінула глыбокі след у душы.

Вось і сягоння з цеплынёю ў сэрцы прыгадваю незабыўныя сустрэчы ў «Іслачы». Уладзімір Міхайлавіч, які ў той час таксама адпачываў у пісьменніцкім Доме творчасці, па кавалачках разабраў маю другую кнігу вершаў, адзначыўшы ўсе яе плюсы і мінусы. Літаральна па кожнай старонцы прайшоўся сваім патрабавальным алоўкам. А я вельмі ўдзячны быў яму за тое, што ён не пашкадаваў вольнага часу дзеля маіх паэтычных практыкаванняў, калі каля іслацкіх сосен шпацыраваў творчы бамонд ледзь не з усяго Савецкага Саюза.

І потым Уладзімір Юрэвіч уважліва сачыў за выхадам кожнай маёй кнігі, двойчы выступаў у друку з водгукамі на іх. Тэлефанаваў дадому ці на працу, каб даведацца аб творчых справах, павіншаваць са святамі альбо новымі публікацыямі. Я пастаянна адчуваў яго бацькоўскі клопат. Дый па ўзросце Уладзімір Міхайлавіч быў аднагодкам майго бацькі…

На вялікі жаль, мае бацькі не дажылі да гэтага часу. І для мяне было вельмі важна ўсведамляць, што побач са мною ёсць людзі, якім неабыякавы мой далейшы лёс. Дый ці толькі мой!..

Ніводзін юбілей любімай радыёпраграмы не праходзіў без удзелу былых «жываслоўцаў». Запісваліся святочныя выпускі, як правіла, у радыёстудыі на Чырвонай, 4. Але праходзілі часам і выязныя пасяджэнні ў школах, бібліятэках. Гэта яшчэ больш набліжала ўдзельнікаў радыёклуба да слухацкай аўдыторыі, давала магчымасць прамога дыялогу.

І да ўсіх без выключэння выпускаў Уладзімір Юрэвіч ставіўся з вялікай адказнасцю, увагай і патрабавальнасцю. Бо гэта — без перабольшання! — было неад'емнай часткай яго жыцця і творчасці.

Уладзімір Юрэвіч зусім нямнога не дажыў да свайго дзевяностагадовага юбілею. Але яго жывое, роднае і гаваркое слова заўсёды крочыць разам з намі. Бо, як слушна заўважыў пісьменнік у сваёй кнізе: «Слова чалавека вечнае, яно не паміраე разам з чалавекам, а застаецца ў памяці іншых — яго дзяцей, родных, сяброў, тых, хто з ім разам жыў, працаваў».

У Евангеллі ад Іаана гаворыцца, што спачатку было слова… А мне падумалася, што ў нашым знаёмстве з Уладзімірам Юрэвічам спачатку было «Жывое слова». І шчыры дзякуй пісьменніку за гэты духоўны скарб!..

# Ушацкім краем узгадаваны

**У які куток нашай слаўнай Беларусі ні завітаеш, ён на пісьменніцкія таленты багаты. Праўда, з адных раёнаў літаратараў больш, з іншых — менш. Затое яны часам належаць да сузор'я першай велічыні. Як Ушаччына, адкуль родам народны пісьменнік Беларусі Васіль Быкаў, народныя паэты Рыгор Барадулін і Пятрусь Броўка, цудоўная паэтэса Еўдакія Лось. Не кажучы пра іншых, хто таксама гэтым краем узгадаваны. Але згадаць Рыгора Іванавіча — асаблівая нагода: 24 лютага — 90 гадоў з дня яго нараджэння. Мяркую, што шмат хто з крытыкаў, дзелячыся ўражаннямі аб яго творчасці, прыгадае і асабістыя стасункі з ім. Былі яны і ў мяне. То скарыстаюся гэтым выпадкам.**



*Рыгор Барадулін.*

Упершыню з яго творчасцю пазнаёміўся першакурснікам, калі купіў кнігу «Нагбом». Праз колькі часу ў «ЛіМе» ўбачыў спіс твораў, вылучаных на атрыманне літаратурных прэмій. Сярод прэтэндэнтаў на прэмію імя Янкі Купалы быў і Рыгор Іванавіч. Паспяшаўся падзяліцца ўражаннем аб яго кнізе. Сваю сціплую публікацыю «Быў бы надта рады» ўбачыў у нумары за 8 снежня 1964 года. Не ведаў, што прэміі такога рангу маладым аўтарам не прысуджаюцца.

Рыгор Барадулін, як вядома, значна пазней, у 1976 годзе, атрымаў Дзяржаўную прэмію БССР імя Янкі Купалы за кнігу паэзіі «Рум» і пераклад твораў Федэрыка Гарсія Лоркі «Блакітны звон Гранады». У тым жа годзе стаў і лаўрэатам прэміі Ленінскага камсамола Беларусі за паэму «Балада Брэсцкай крэпасці». Аднак першыя спатканні з яго паэзіяй, безумоўна, не прайшлі для мяне бясследна. Яны далі вельмі адчувальны імпульс, з якога і пачалася любоў да паэзіі ўвогуле, а з ёю прыйшлі і адкрыцці іншых аўтараў. Рыгор Барадулін як бы падштурхнуў маю душу, што да пары да часу драмала, не разумеючы адну простую ісціну: нельга па-сапраўднаму любіць літаратуру і пры гэтым не любіць паэзію. Асабліва, калі яна барадулінскага кшталту. Ці не гэта меў на ўвазе цудоўны знаўца беларускай паэзіі (хоць правільней сказаць — паэзіі ўвогуле) незабыўны Варлен Бечык, калі сцвярджаў, што, знаёмячыся з вершамі Рыгора Барадуліна, «расцеш душой».

Я ж тады і пачынаў расці ёю. Па-сапраўднаму гэты «рост» адбыўся пазней, калі прачытаў іншыя паэтычныя кнігі. Спачатку мая душа «выпрасталася», пазбаўляючыся няведання паэзіі, а разам з гэтым і нігілістычнага стаўлення да яе. І, прызнаюся, на паверку аказалася, што гэта не так і цяжка — палюбіць паэзію, пранікнуцца да яе павагай і ўвагай. Ды і хіба можна інакш, калі яна бярэ за саму душу. Ва ўсякім разе тады невыпадкова вылучаў верш «Паляць бульбоўнік»:

*Я гэты ціхі дым*
*на смак*
*і навобмацак ведаю,*
*яго ні з чым не паблытаю,*
*любой парою,*
*дзе б ні быў,*
*адусюль*
*па ім, як ганчак па следу,*
*дарогу дадому знайду,*
*да матчынага парога.*

На той час менавіта ён надзіва адпавядаў майму настрою. Прачытаўшы, апынуўся на яго роднай Ушаччыне, але не толькі на ёй. У кнізе «Нагбом» адкрылася паэтава любоў да мінуўшчыны. Аднак не ўвогуле, а беларускай. Гэта ён цудоўна прадэманстраваў у вершы «Сафійка». Твор шмат гаворыць пра нашу багатую гісторыю, пра любоў народа да сваёй даўніны:

*Не скажуць у Полацку:*
*— Сафійскі сабор.*
*Тут яго называюць ласкава:*
*— Сафійка...*
*Так партызаны*
*сваіх сувязных называлі.*
*Так гукаў я калісьці*
*дачку суседскую.*

Не сумняваюся, што і шмат для каго свет паэзіі па-сапраўднаму адкрываўся дзякуючы творам Рыгора Іванавіча. Нехта, хто, як і я, размяняў свой восьмы дзясятак, «вучыўся» па яго першых кнігах. На гадоў дзесяць маладзейшыя ўваходзілі ў неабсяжны свет яго паэзіі са зборнікамі «Рум», «Вечалле», а можа, і аднатомнікам «Свята пчалы». Ну а самыя маладыя выхоўваюцца на кнігах, напісаных ім у апошнія гады жыцця.

У кнізе «Нагбом» ёсць і верш «Куліна», з якога паўстае незабыўны воблік маці паэта, а ў ім такі пачатак:

*Кожны мае*
*свае Ушачы,*
*хату*
*і двор,*
*пазарастаны маркоўнікам,*
*дзе можна пасля дарогі,*
*скінуўшы чаравікі*
*і потную шапку,*
*адчуць халадок зямлі,*
*пачуць шум лісця,*
*маркотны і памяркоўны.*

Сапраўды, у кожнага з нас свае Ушачы, але не кожныя «Ушачы» даюць такіх паэтаў, як Рыгор Барадулін. Мяне ж радуюць не толькі яго кнігі, але і аўтографы на іх. Іх ні многа ні мала, а 13. Яшчэ адно пацвярджэнне, што і гэтая лічба можа быць шчаслівай. Каторую кнігу ні вазьму, душу адвяду. Хоць бы гэтую — невялікую, тоненькую, кішэннага фармату «Неакадэмічная калода» з падзагалоўкам «Сяброўскія шаржы. Эпіграмы». Эпіграмы напісаў Рыгор Іванавіч, а шаржы намаляваў заслужаны артыст Беларусі Фама Варанецкі. Ён хацеў быць мастаком, але, стаўшы акцёрам, з жывапісам не развітаўся. Надпіс жартаўлівы: «Алесю Марціновічу, якога кахаюць акторкі, а я люблю! Рыгор Барадулін. 28 ІІ 94. Менск».

Своеасаблівым падарункам яму да 50-годдзя стала кніга «Каждый четвертый», выпушчаная ва ўсесаюзным выдавецтве «Советский писатель». Радасцю паспяшаўся падзяліцца: «Дарагому Алесю Марціновічу — з падзякай за ўсе клопаты, за спагаду. Рыгор Барадулін. 7. VІІ. 84. Мінск». Яна магла прынесці яму яшчэ адну радасць. Праз чатыры гады была вылучана на Дзяржаўную прэмію СССР. Калі паведамленне з'явілася ў друку, я напісаў рэцэнзію «Суровы адлік памяці», якую газета «Вячэрні Мінск» надрукавала 14 верасня 1998 года. Шкада, што Рыгор Іванавіч лаўрэатам не стаў.

На кнізе «Вечалле» такі надпіс: «Дарагому Алесю Марціновічу — шчыраму, адкрытаму, бескампраміснаму з сяброўскай павагай і даўняй удзячнасцю! Заўсёды Ваш Рыгор Барадулін. Мінск, 81». На томіку вершаў і паэм «Поэма признания» ў аўтарызаваным перакладзе з прадмовай народнага паэта Беларусі Пімена Панчанкі подпіс удзячны: «Дарагому і любаму Алесю Марціновічу — дзякуй за ласку, за шчырасць, за спагаду! Пакуль ёсць такія людзі, і жыць, і пісаць хочацца! Рыгор Барадулін. Мінск, 82». Падарыў ён і кнігу лірыкі і гумару «Амплітуда смеласці»: «Дарагому Алесю Марціновічу з падзякай за шчодрасць шчырасці, ад якой душа нядзеліцца! Ад аднаго ўшацкага мальца, што перад Алесем у няплатным даўгу. Рыгор. 1. VІ. 83. Мінск».

Яшчэ адна кніга мае крыху нечаканую назву — «Кахаць — гэта значыць...». Аднак, пачаўшы знаёміцца з ёю, упэўніваешся, наколькі дакладна. Дзе яшчэ знойдзеш пад адной вокладкай стольκі перакладаў: са старажытнарускай, польскай, сербалужыцкай, нямецкай, англійскай, французскай і іспанскай моў. Як пасля гэтага ні прачытаць яе, ды яшчэ з такім надпісам: «Алесю Марціновічу толькі з падзякай, толькі з пашанай! Рыгор Барадулін. 21 Х 86. Мінск».

Не менш арыгінальная і кніга «Беларусь мяне збеларушвае». Менавіта так пра беларусаў сказаў выдатны ўкраінскі паэт і грамадскі дзеяч Мікола Бажан. У зборніку дзясяткі паэтаў, творы якіх перакладзены Рыгорам Іванавічам, прызнаюцца ў любові да Беларусі. Адштурхоўваючыся ад гэтага, ён пакінуў на асобніку яшчэ адзін жартаўлівы аўтограф: «Шаноўнаму Алесю Марціновічу ад усіх паэтаў, якія любяць Беларусь і яго! Рыгор Барадулін. 28. ІІІ. 94». А вось у зборніку эпіграм «Асобы рознай пробы», што выйшаў у «Бібліятэцы "Вожыка"» у суаўтарстве з мастакамі Анатолем Гармазой і Міколам Гіргелем, «жартавалі» самі творцы, таму давялося пакінуць аўтограф сур'ёзны: «Дарагому сэрцу майму Алесю Марціновічу на поўным сур'ёзе! Рыгор Барадулін. 23. VІІІ. 94».

Кніга «Аратай, які пасвіць аблокі» з падзагалоўкам «Сяброўскае слова, эсэ і неканаізаваныя ўспаміны» ўпэўніла, што Рыгор Іванавіч годна адчувае сябе і як крытык, і ў пэўнай ступені як даследчык літаратуры. Кажу гэта не толькі з удзячнасцю за добрыя словы, сказаныя ў мой адрас: «Майму дарагому сябру Алесю Марціновічу — З нязменнай падзякай! Рыгор Барадулін. 26. ХІІ. 95. Менск». Барадулінскае «Евангелле ад мамы» — яшчэ адно пацвярджэнне, што не стамлялася пяро паэта: «Шаноўнаму Алесю Марціновічу, каго люблю, кім захапляюся, каму ўдзячны да скону! Рыгор Барадулін. 28. VІІІ. 95. Менск».

А гэтую кнігу праглядаю з асаблівым хваляваннем. Не толькі таму, што яна апошняя з падпісаных Рыгорам Іванавічам. З яе старонак «зорка зорцы голас падае». Як вядома, так цудоўна народны паэт Беларусі Аркадзь Куляшоў пераклаў радкі «<...> И звезда с звездою говорит» са знакамітага верша Міхаіла Лермантава «***Выхожу один я на дорогу...». Я ж маю на ўвазе Рыгора Барадуліна і Васіля Быкава. Іх «голас» гучыць са старонак кнігі Рыгора Іванавіча «Лісты ў Хельсінкі». Падпісаў так: «Дарагому сэрцу майму Алесю Марціновічу — вечны дзякуй! 18. 09. 2000. Рыгор. Менск».

Назва — «Лісты ў Хельсінкі» — невыпадковая. Са студзеня 1998 года да чэрвеня 2000-га Васіль Быкаў жыў у Фінляндыі. У кніжцы паралельна на дзвюх старонках змешчаны арыгінал тэксту Рыгора Іванавіча і яго друкаваны варыянт. Злева — дробны, убарысты почырк Васіля Быкава. Справа — гэты тэкст, набраны курсівам дробнага памеру. Малюнкі Васіля Уладзіміравіча, створаныя ў далечыні ад Беларусі, склалі заключны раздзел «Водгалас». Як бы кніжачка ў кніжцы. Малюнкі штрыхавыя, у нечым эскізы-накіды, якія б маглі «пашырыцца» і ў больш значныя творы. Толькі ў гэтым неабходнасці не было. Галоўнае — улавіць пэўны момант, адчуць мімалётны настрой.

Кніг, падораных Рыгорам Іванавічам, у маёй хатняй бібліятэцы магло быць і больш як тузін. За кошт тых, што напісаны ім для дзяцей. А такіх з-пад яго пяра таксама з'явілася шмат: «Красавік», «Экзамен», «Ай, не буду! Не хачу!», «Што было б тады, калі б?», «Ці пазяхае бегемот?», «Індыкала-кудыкала», «Кобра ў торбе» і іншыя. Некаторыя з іх і мне падарыў. Але гэта было яшчэ тады, калі з халасцякаваў. Таму перадаў іх сваім пляменнікам. Засталася толькі «Як воўк калядаваў»: «Самаму працавітаму й талентавітаму Алесю Марціновічу — Чытайце праправнукам бадзёрым голасам! Дзед Рыгор. 16. 02. 01. Менск».

Разумею, што такімі высокімі эпітэтамі ён ацаніў маю творчую працу шмат у чым не толькі авансам, але і завышана. Найперш гэта тычыцца «таленавітасці». Чаго добрага папярхнуцца тыя, хто класікам сябе лічыць, канкурэнта ўбачыць у маёй асобе. Хоць аб працавітасці, не ўспрыміце гэта пахвальбой, у нечым праўдзіва гаварыў. Пісаў я шмат, нямала і цяпер пішу. Як — не мне меркаваць. Ды не пра мяне гаворка... Найперш пра тое, што сапраўдны талент, а такім і быў Рыгор Барадулін, ніколі творча не зайздросны, умее радавацца таму, што робяць іншыя.

Калі бяруся праглядаць барадулінскія кнігі з дарчымі надпісамі, адарвацца не магу. Кожную чарговую падоўгу затрымліваю ў руках. Адгарнуўшы вокладку, запыняю позірк на некалі напісаным ім. Цяпер ужо яно ўспрымаецца і прамоўленым Рыгорам Іванавічам. Ад шчырага сэрца. З усведамленнем таго, як гэта прыемна ў тлумны і неспакойны час падтрымаць таго, каму, магчыма, не стае радасці ці яе куды меней, чым хацелася. Сапраўдныя ж паэты не толькі думаюць вершамі — яны ўмеюць яшчэ і зазірнуць у чужую душу. Адчуць тое, чаго ў чалавеку іншыя не заўважаюць. То каму б і не сказаць яму спагадные слова. Магчыма, у нечым і авансам. Але ж аванс заўсёды адпрацоўваць трэба, то, глядзіш, чалавек пастараецца апраўдаць аказаны яму давер, памкнецца быць яшчэ лепшым.

Не стала Рыгора Барадуліна 2 сакавіка 2014 года. Свой вечны спачын знайшоў на могілках ва Ушачах поруч з маці Кулінай Андрэеўнай. Магілы знаходзяцца як бы на кургане. Само па сабе гэта ўжо сімвалічна. Адсюль яму добра відаць усю Беларусь, адным з самых выдатных песняроў якой з'яўляўся. Сімвалічна і тое, што яму і Васілю Быкаву на радзіме пастаўлены помнікі. Для абодвух блізкае тое, што сказаў Васіль Уладзіміравіч: «Паэзія Барадуліна — чыстай красы Боская паэзія беларусаў, крыніца нацыянальнага натхнення, складнік яе спрадвечнага духоўнага набытку. Тое асабліва адчувальна, калі апынуцца ў расстанні з ёю...» Толькі замест паэзіі трэба сказаць літаратура. Гэта тычыцца іх абодвух, ушацкім краем узгадаваных.

**Алесь МАРЦІНОВІЧ**

# Жывая гісторыя

**У межах патрыятычнага праекта «80 мірных гадоў! Беларусь памятае», які рэалізоўваецца філіялам «Мальская сельская бібліятэка-клуб» і СШ № 1 (Астравецкі раён), арганізавана візіт-акцыя «Горкае дзяцінства». Школьнікі завіталі ў госці да Сафіі Рудніцкай, якая нарадзілася акурат у пачатку вайны — у 1941 годзе. Гады дзяцінства жанчыны прайшлі ў Вілейскім раёне Мінскай вобласці. Той час быў напоўнены выпрабаваннямі.**

Сафія Рыгораўна глядзіць на сваіх юных гасцей. Усе прыгожа адзеты. Але яна прыгадвае гады свайго дзяцінства:

— Лапцікі пашылі мне, калі пайшла ў школу. У першы клас прахадзіла да зімы, а зімой не пайшла — было холадна. Апрануць не было чаго. Няма мяне адзін дзень, другі, трэці. Гэта заўважыла настаўніца. Прыйшла да нас, а я ў гэты час ляжала на печы. Яна пачала ўгаворваць, каб ішла ў школу, а я расказваю ёй пра тое, што холадна і апрануць няма чаго. Але пасля пачала зноў у школу хадзіць. Так і скончыла сем класаў.

Для сучасных дзяцей і падлеткаў гэтая сітуацыя не заўсёды зразумелая. Сёння ў кожнага ёсць не толькі абутак і адзенне, але і цацкі, гаджэты. Тым часам Сафія Рыгораўна працягвае свой аповед:

— Колісь жылі ўсе ў зямлянках. І, ведаеце, — дружна жылі. У горы ўсе дружна жывуць, бо гора заўсёды аб'ядноўвае. Хоць і галадалі, хадзілі босыя, не мелі адзення. Самі шылі простыя кашулі. А выжывалі дзякуючы таму, што сеялі лён і каноплі. Кароў у той час не было. Немцы кароў пазабіралі. Шмат людзі ад іх тады нацярпеліся. Тады яны расстрэльвалі, гвалтавалі маладых дзяўчат.

Голад, холад, страх і галеча былі спадарожнікамі ў ваенныя часы. Здавалася, што ніколі ўжо не будзе светлага, чыстага і добрага.

Немцы кароў пазабіралі... твары. Праз некалькі хвілін працягвае расказваць.

— Побач з нашай спалілі яшчэ дзве вёскі з жывымі людзьмі. Сагналі іх у вялікі будынак і знішчылі. Нас пасля са школы вадзілі туды на экскурсію. Здавалася, што там яшчэ пахне спаленымі



*Падчас сустрэчы.*

людзьмі… Не дай Бог такому здарыцца. Цяжка было і ў вайну, і пасля яе. Яшчэ і сёння памятаю, як тата плёў лапці, а мама жала траву, сушыла, а пасля рабіла з яе чорныя ляпёшкі. Былі яны надзвычай горкімі на смак. Але даводзілася есці, каб жыць. Было нас у мамы чацвёра. Пятую сястру немцы забілі ў чатырнаццаць гадоў. Жудасная была тая вайна.

— Калісьці немцы спалілі цэлую нашу вёску. Фашыст загадаў выйсці жыхарам з хат, тады іх падпалілі. Гэта ўсё з-за таго, што побач у лесе былі партызаны. Такім чынам фашысты вырашылі пакараць людзей. Маю сястру забілі немцы. Яна была ў лесе з каровай. Тады пазабівалі ўсіх, хто хаваўся ў лесе. У тым ліку і мамінага роднага брата з жонкай і іх маленькае дзіцятка. Жах гэта быў.

На нейкі момант жанчына спыняецца, каб перавесці дух. Стараецца ўтаймаваць свае пачуцці і не плакаць. Але слёзы ручайкамі бягуць па яе

Жывыя гісторыі ваеннага часу бясцэнныя...

**Вольга ЗАЯНЧКОЎСКАЯ**
**Фота даслана аўтарам**

# Помнім, шануем, ганарымся

**Грамадзянска-патрыятычнае выхаванне з'яўляецца адным з прыярытэтных кірункаў дзейнасці філіяла «Казлоўшчынская гарпасялковая бібліятэка — цэнтр агульнадаступнай інфармацыі» (Дзятлаўскі раён). Святкаванне 80-годдзя вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў надало новы імпульс рабоце. Каб годна адзначыць юбілейную дату, работнікі бібліятэкі правялі шмат сацыякультурных мерапрыемстваў і арганізавалі пошукава-даследчую дзейнасць па зборы інфармацыі аб мясцовых удзельніках і героях Вялікай Айчыннай вайны.**

У першую чаргу ўвага была накіравана на мастацкае афармленне бібліятэкі. Супрацоўнікі падрыхтавалі фотазону «Беларусь памятае» і выстаўку-экспазіцыю «Гісторыя Перамогі». Фотазона змяшчала фотавыстаўку «Па дарогах вайны ішлі мае землякі» са здымкамі ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, інтэрактыўную карту Беларусі з адзначэннем дат вызвалення краю ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, выявы ордэнаў і медалёў таго перыяду.

Правялі шэраг мерапрыемстваў, сярод якіх — урокрэквіем «Дзеці вайны», агляд літаратуры на выстаўцы «Славім Вялікі Подзвіг», віктарына «Эхо войны», дзень інфармацыі «Памяць і боль беларускай зямлі», дзень ваеннай кнігі «Радкі з вогненных гадоў». З дапамогай віртуальнага падарожжа «Іх імёнамі названы вуліцы» можна было пазнаёміцца з вуліцамі Дзятлаўшчыны, названымі ў гонар герояў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны.

Прынялі ўдзел у інтэлектуальным конкурсе літаратурна-пазнавальных інтэрнэт-рэсурсаў «Это нашей истории строки» і падрыхтавалі відэа з месца пахавання сям'і У. Чараховіча, якая была расстраляна за ўдзел у партызанскім руху.

У патрыятычнай анлайн-акцыі «Напішы пісьмо салдату» прынялі ўдзел вучні 4 «А» класа. Да віртуальнага альбома «80 фотокадров о войне» прадставілі матэрыял пра ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны К. Валодзьку, У. Зяновіча і М. Валькова; удзельнічалі ў літаратурным фотачэленджы «Мой літаратурны герой» па аповесці Б. Васільева «А зоры тут ціхія», які быў размешчаны на сайце Дзятлаўскай раённай бібліятэкі.

На базе Казлоўшчынскай бібліятэкі адбыўся раённы семінар бібліятэчных работнікаў «Бібліятэка як рэсурс захавання гістарычнай памяці раёна: ваенна-патрыятычны аспект». Была падрыхтавана фотавыстаўка «Гісторыя ў асобах». Тут размешчаны і фотаздымкі 50—80-х гадоў мінулага стагоддзя, на якіх адлюстраваны сустрэчы былых партызанаў з работнікамі і навучэнцамі ПТВ-191, генерала В. Канавалава, які ўдзельнічаў у вызваленні Дзятлаўшчыны, з жыхарамі пасёлка.

Удзельнічаючы ў раённым конкурсе на найлепшы гісторыка-краязнаўчы матэрыял «Мы помнім, шануем, ганарымся», бібліятэкары правялі пошукавую і даследчую работу, прысвечаную удзельнікам і ветэранам Вялікай Айчыннай вайны. Для ўвекавечвання памяці і захавання гісторыі ўсенароднага подзвігу аформілі альбом.

**Людміла ХІЛІМОНЧЫК**



*Падчас мерапрыемства.*

# Крыніца мудрасці

Змэтай папулярызацыі беларускай літаратуры, дэманстрацыі багацця патэнцыялу айчынных выданняў, развіцця цікавасці маладых людзей да кніг беларускіх аўтараў у Інтэграванай бібліятэцы аграгарадка Дворышча (Лідскі раён) правялі літаратурны вернісаж «Крочым родным краем, фарбы ўсе збіраем» у рамках акцыі «Будзь у трэндзе — чытай беларускае».

Удзельнікамі мерапрыемства сталі вучні 4 класа Дварышчанскай сельскай школы, якія праявілі сябе кемлівымі ў гульні «Даскажы слова». Кніга — крыніца ведаў і мудрасці, якая вучыць нас дабрыні, адважнасці, кемлівасці, назапашвае і перадае жыццёвую мудрасць, што спасціглі нашы продкі, а мы можам пацвердзіць гэта, адгадваючы загадкі, адказваючы на пытанні і абмяркоўваючы змест твораў беларускіх пісьменнікаў.

**Людміла МАРЦІНКЕВІЧ**
**Фота даслана аўтарам**

## млын навін

На базе Быхаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі, якая носіць імя вучонага-мовазнаўцы і пісьменніка Барыса Стральцова, ужо больш чым 20 гадоў дзейнічае клуб па інтарэсах «Залаты ўзрост». Чарговае яго пасяджэнне адбылося напярэдадні Міжнароднага дня роднай мовы. На літаратурна-музычную кампазіцыю «І льецца мілагучнае слова, родная беларуская мова» быў запрошаны зямляк, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, заслужаны журналіст, ганаровы грамадзянін Быхаўскага раёна і даўні добры сябар бібліятэкі Мікалай Леўчанка. Разам з ім прыйшла жонка Тамара Андрэеўна, якая на працягу многіх гадоў з'яўляецца падтрымкай і галоўным натхняльнікам. Мікалай Уладзіміравіч чытаў свае вершы, прысвечаныя роднай мове і радзіме. Прысутныя пачулі і твор, напісаны спецыяльна да свята. Гучалі песні, вершы, байкі, гумарэскі, нават невялікія казкі ў выкананні ўдзельніц клуба.

**Алена СІДАРЭНКА**

* * *

Год таму ў Астравецкай дзіцячай бібліятэцы пачаў дзейнічаць «Тэатр чароўных лялек». А сёлета пры бібліятэцы створана аматарскае аб'яднанне для ўсіх ахвотных «Казачная краіна лялек». Удзельнікі штомесячна будуць знаёміцца з гісторыяй тэатра, славутымі дзеячамі, прынцыпам размеркавання роляў. Акрамя таго, на занятках плануюць абмяркоўваць новыя спектаклі, падбіраць касцюмы, ставіць пастаноўкі і ўдзельнічаць у самых розных святах. Таксама ўдзельнікі аб'яднання будуць арганізоўваць тэтралізаваныя чытанні, арт-выстаўкі, майстар-класы, майстраваць розныя вырабы сваімі рукамі.

**Вольга ЗАЯНЧКОЎСКАЯ**

* * *

Нядаўна ў Горацкай цэнтральнай бібліятэцы імя М. Гарэцкага хлопчыкі і дзяўчынкі з сярэдняй школы № 1 пазнаёміліся з магілёўскай дзіцячай пісьменніцай Галінай Пярун.

Госця прэзентавала свае новыя кнігі «Прыгоды сяброў і парады ад Усімдапамагайкіна», «Лясныя свавольнікі» і «Закаханы скідзень», а затым разам з прысутнымі адправілася ў вандроўку па старонках выданняў, якія былі прадстаўлены на выстаўцы. Аўтар пазнаёміла дзяцей са сваімі чароўнымі лялькамі з уласнага тэатра «БІ-БА-БО». Пасля адбыўся паказ па казцы «Як ліса гаспадыняй у дзеда была».

Шмат цёплых слоў у адрас госці прагучала ад калег па пяры Наталлі Ніканчук, Людмілы Дзёменскай, Ларысы Грушынай, Алесі Азаранкі, Аляксандра Ведзянеева.

**Вольга МАКСІМАВА**

* * *

Дзятлаўская зямля багатая на таленты, якія даследуюць, услаўляюць, а найперш любяць свой край. На шчасце, тут былі і ёсць энтузіясты-краязнаўцы, якія добра ведаюць, колькі звестак можна сабраць і захаваць для нашчадкаў. Гэта людзі розных прафесій, але іх аб'ядноўвае любоў да малой радзімы. У 2022 годзе ў раённай бібліятэцы пачалася работа над краязнаўчым праектам «Малая Радзіма ў падзеях і тварах». Пачаты збор і пошук матэрыялаў для стварэння базы даных «Іх імёны ў гісторыі краю», якая размешчана на сайце раённай бібліятэкі.

**Марына КРУПІЦА**

* * *

У Войстамскай сельскай бібліятэцы (Смаргонскі раён) прайшло мерапрыемства «Выдатны свет паэзіі». Удзельнікі аматарскага аб'яднання «Гаспадыня» натхніліся вядомымі паэтамі свету: Амарам Хаямам, Фрыдрыхам Шылерам, Чжан Лэем, Уільямам Шэкспірам, Луісам Камоэнсам, якія пакінулі глыбокі след у літаратуры. Адказалі на пытанні літаратурнай віктарыны.

**Юлія ЖУК**

# У краі прыгожых мар

**На мінулым тыдні ў галерэі «Панарама» Нацыянальнай бібліятэкі прайшло адкрыццё выстаўкі «Краіна маёй мары» Анатоля Дрыбаса, знакамітага майстра, заслужанага журналіста Беларусі, члена Беларускага грамадскага аб'яднання фатографаў, народнага фотаклуба «Мінск», аўтара і суаўтара розных друкаваных выданняў, прысвечаных культурнаму і прыроднаму багаццю краіны.**

Гэтым разам гледачу прадставілі фотаработы Анатоля Дрыбаса, у якіх выяўлены розныя гарады Беларусі. Мэты выставачнага праекта, як бачыцца, — паказаць, як захоўваюцца архітэктурныя помнікі, звярнуць увагу на тое, як змяняецца аблічча старажытных гарадоў, нагадаць пра вялікі турыстычны патэнцыял розных куткоў краіны. Клопату ўлад і гараджан аб родных мясцінах ды іх славутасцях, адлюстраваных таленавітым фотамайстрам, і прысвечана экспазіцыя «Краіна маёй мары», прымеркаваная, між іншым, да Года добраўпарадкавання.

Анатоль Пракопавіч больш за чатыры стагоддзі вывучае розныя куткі Беларусі і захоўвае свае ўражанні з дапамогай мастацтва фатаграфіі. Гэта разнабаковы аўтар, хоць і абыякавы да партрэтных здымак. Вядомы ён болей як пейзажыст, назіральнік, уважлівы і да прыроднага хараства, і да жыцця людзей, стваранага імі асяроддзя. Штогод Анатоль Дрыбас разам з аднадумцамі здзяйсняе невялічкія падарожжы. Так, яго цікавяць не толькі значныя падзеі ў жыцці таго ці іншага рэгіёна, якія звяртаюць на сябе ўвагу грамадства, — фотамастак захоўвае ў сваіх работах найтанчэйшыя перамены ў прыродзе, яе стан і настрой.



Падчас адкрыцця выстаўкі.



Анатоль Дрыбас падчас адкрыцця выстаўкі.

Аднак на выстаўцы «Краіна маёй мары» гаворка ідзе выключна аб гарадскім і паркавым пейзажы, аб адлюстраванні асобных помнікаў архітэктуры, якімі беларусы ганарацца. Майстар скрупулёзна фіксуе назіранні, мае сур'ёзны архіў… На выстаўцы «Краіна маёй мары» прадстаўлены пераважна фотаздымкі абласных гарадоў, зробленыя ў 2020—2025 гг.

— У гэтыя кадры ўкладзена шмат працы, — расказаў падчас адкрыцця экспазіцыі Анатоль Пракопавіч. — Аднак гэта вельмі маленькая частка ад усяго архіва, які назбіраўся за 41 год работы фатографам. Спачатку я быў лабарантам-фатографам, але недзе з 2000 года, з пачаткам лічабавай эры, набыў лічбавы апарат і пачаў працаваць як карэспандэнт.

Дарэчы, сярод работ на выстаўцы — дзевяць панарамных здымкаў, але ў архіве, па словах Анатоля Дрыбаса, налічваецца болей за 500 кадраў, знятых у Мінску, і каля 600 розных пейзажных здымкаў. У аўтара ёсць планы стварыць альбомы, якія б пазнаёмілі публіку з гэтымі панарамамі. Праца ідзе.

— Вельмі прыемна, што выстаўка праходзіць менавіта ў Нацыянальнай бібліятэцы, — адзначыў намеснік генеральнага дырэктара кніжніцы Віктар Пшыбытка. — Па-першае, выставачная прастора галерэі «Панарама» выдатна падыходзіць для гэтага праекта. Болей за тое, да нас завітвае вялікая колькасць турыстаў, і, я думаю, многія, разглядаючы гэтыя фотаздымкі, знойдуць на іх родныя мясціны. А, па-другое, жыццё Анатоля Пракопавіча, вядома, непарыўна звязана не толькі з фотаапаратам, але і з кнігай. Толькі ў Нацыянальнай бібліятэцы захоўваецца болей чым 400 найменняў дакументаў, у стварэнні якіх удзельнічаў Анатоль Дрыбас.

Павіншаваць калегу з адкрыццём выстаўкі прыйшлі старшыня Беларускага грамадскага аб'яднання фатографаў Уладзіслаў Рута, член гэтай суполкі, а таксама народнага фотаклуба «Мінск» Аляксандр Рабцэвіч ды іншыя. Член БГАФ, аўтар фотаальбомаў і даведнікаў пра Беларусь, дырэктар Рэспубліканскага фонду развіцця турызму і падтрымкі дзікай прыроды «Планета без межаў» Сяргей Плыткевіч зазначыў:

— Анатоль Дрыбас вылучае сярод іншых не толькі энцыклапедычны падыход да фатаграфіі, але і працаздольнасць, пра што сведчаць у тым ліку шматлікія кнігі з яго ілюстрацыямі. Для фатографаў ён прыклад. Можна быць таленавітым і мець цікавыя ідэі, але без працавітасці, без ранніх пад'ёмаў і позніх вяртанняў у ложак верагоднасць шматлікіх поспехаў, напэўна, значна памяншаецца. Да таго ж Анатоль Дрыбас — найвыдатнейшы тэхнік. Тое, што здымаюць і іншыя, ён здольны паказаць пасвойму.



Фотаздымкі, зробленыя майстрам у Гомелі.

Такія праекты, як «Краіна маёй мары» (з ім можна пазнаёміцца да 20 сакавіка), звычайна ўспрымаюцца публікай пазнавальна. Усё залежыць ад вопыту гледача: наведваў ён тыя ці іншыя выдатныя мясціны, бачыў толькі на фотадымках альбо ўпершыню сутыкаецца з іх выявамі. Адчуванні, пачуцці, думкі ў кожным выпадку, безумоўна, розныя. Разам з тым усе назіральнікі сустракаюцца ў адной прасторы, у адзін час — іх фатограф перадаў так, а не інакш. І хочацца любавацца архітэктурнымі дамінантамі, узірацца ў дэталі кампазіцыі, адшукваць і засяроджвацца на самым істотным… Для гэтага не хапае хіба толькі вартага — болей буйнога — фармату друку. Здымкі шаноўнага Анатоля Дрыбаса, бясспрэчна, прадугледжваюць і заслугоўваюць гэтага.

**Яўгенія ШЫЦЬКА,**
**фота аўтара**

# Роздум аб вытоках

**Персанальныя фотавыстаўкі для Мінска не рэдкасць — аўтары маюць магчымасць рэгулярна праводзіць творчыя справаздачы. Калі-нікалі ладзяцца вялікія выставачныя праекты, дзе розныя фатографы знаёмяць са сваімі напрацоўкамі. Часцей гэта адбываецца на фестывалях і конкурсах, якія дазваляюць выстаўляцца і жывапісцам, і скульптарам, і майстрам дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва… А вось экспазіцый, дзе б плён прадстаўляў калектыў фатографаў, зусім мала.**

Вынік якраз супольнай работы — выстаўка «Пачатак Нёмана» ў мастацкай галерэі Інстытута тэалогіі БДУ. З новымі творамі пазнаёмілі Альберт Цэхановіч і Вольга Сяргеева, а таксама фатограф-пачатковец Ілья Савянкоў. Для маладога чалавека гэты праект дэбютны, хоць фотаздымкі і тэхніка, у якой яму давялося папрацаваць, не выяўляе ў ім навічка. Так, усе работы выкананы ў рэдкай сёння тэхніцы брамойль — дакладней, у яе сучаснай інтэрпрэтацыі: па сярэбраным адбітку на фотапаперы наносіцца алейная мастацкая фарба, далей — прапрацоўка і выдзяленне значных дэталей выявы…

Знаёмства Альберта Цэхановіча і Вольгі Сяргеевай з Ільёй Савянковым, далучэнне маладога калегі да работы ў розных фатаграфічных тэхніках, сумесныя паездкі і здымкі, друк фатаграфій на фотапавелічальніку, агульная праца ў майстэрні — усё гэта паспрыяла таму, каб выстаўка адбылася. «Пачатак Нёмана» адлюстроўвае зімовыя (іх здымалі Альберт Цэхановіч і Вольга Сяргеева) і вясновыя (за іх у экспазіцыі адказваў Ілья Савянкоў) краявіды Уздзеншчыны (Мінская вобласць). На фотаздымках — наваколлі вёсак Верх-Нёман, Даўгінава, Вясёлае, Лоша, Кухцічы і Наднёман, пэўна, нават для жыхароў гэтых паселішчаў амаль непазнавальныя, відазмененыя аўтарамі фота.

Канцэпцыю выстаўкі можна тлумачыць па-рознаму, але ў пэўнай ступені кожная трактоўка зводзіцца



Фота аўтара.

Фотаздымкі Ільі Савянкова.



Фота са старонкі Інстытута тэалогіі БДУ ў «ВКонтакце».

Падчас адкрыцця.

да паняцця «вытокі». Тут і прамое значэнне: гаворка ідзе пра Нёман як пра адзіную беларускую раку, якая пачынаецца ў Беларусі і ўпадае ў мора, а яе выток геаграфічна размешчаны ва Уздзенскім раёне. Што да пераноснага сэнсу, то тут аўтары запрашаюць да роздумаў аб залежнасці людзей, якія жывуць на адведзенай ім тэрыторыі, ад улады вялікай прыроды, аб лёсе чалавека, прывязнага да пэўнага кавалку зямлі, аб бацьці вёскі — у мінулым і сёння. Аднак гэта толькі здагадкі, бо ў работах аўтараў, на шчасце, адсутнічае прамалінейнасць выказвання. Гэта глыбокія творы фотамастацтва, здольныя зачараваць патаемнай сілай, схаванай нават у самых, як можа камусьці здацца, сціплых пейзажах.

Наведаць выстаўку «Пачатак Нёмана», куратарам якой выступае Альберт Цэхановіч, можна да 31 сакавіка.

**Яўгенія ШЫЦЬКА**

# Каб гэта засталося



**Тыя, хто даўно ведае творчасць мастака Уладзіміра Лукашыка (1953 — 2023), відаць, успомняць многія кнігі з яго афармленнем. Што прыцягвала і цяпер прыцягвае ў яго работах? Што развівае еднасць гледача з мастаком праз пільнае знаёмства з яго графічнымі малюнкамі? Найперш — лаканічнасць, відавочнае жаданне дайсці да галоўнага, сутнаснага. Ён ніколі не спяшаўся. Магчыма, некаму падаецца, што выконваў сваю працу кніжнага графіка даволі марудна… Але плён, вынік пераконвае, што шлях, абраны мастаком, быў правільным. Таму і застаюцца ў памяці надоўга, ужо толькі пасля першага прагляду, яго пераканаўчыя, яго гаваркія ілюстрацыі да кніг Леаніда Дайнекі, Алеся Краўцэвіча, Генрыха Далідовіча, Васіля Гігевіча…**

Пасля смерці мастака Нацыянальная бібліятэка Беларусі выдала каталог «Уладзімір Лукашык. 1953—2023 [Выяўленчы матэрыял]: станковая і кніжная графіка. Дызайн». Аўтары-складальнікі — Валянціна Дзеразкова, Лізавета Янусік. З уступнага артыкула да каталога: «…Асноўная частка яго работ — дызайн і ілюстрацыі да кніг і артыкулаў. Дызайн кнігі Уладзіміра Лукашыка — гэта строгая сістэма элемента навігацыі і графікі, якая разбаўляецца тонкімі філасофскімі малюнкамі. Яго графіка і сапраўды філасофская: у жаночых партрэтах адчуваецца характар кожнай мадэлі, яе настрой; пейзажы выглядаюць безжыццёва прывабнымі, а старадаўнія рэчы нашых продкаў намаляваны дасканала выверана з захапленнем кожнай дэталлю. У любым графічным аркушы бачна рука майстра: аб’ект выкананы з невялікай стылізацыяй, прамым асвятленнем і дробнай прапрацоўкай фактуры». Два раздзелы каталога адкрываюць перад намі амаль сто работ Уладзіміра Лукашыка: у «Графіцы» — 31 рэпрадукцыя; у раздзеле «Жаночыя партрэты» — 66…



*Ілюстрацыя да кнігі П. Васючэнкі «Жылі-былі паны Кубліцкі ды Забалоцкі», 2003 г.*

Раздзел «Графіка» адкрываецца работамі «Брама вольнасці. 2023 (папера, лічбавае маляванне, лічбавы друк)» і «Брама. 2017 (папера, лічбавае маляванне, лічбавы друк)». З уступнага артыкула да каталога: «У апошнія гады мастак працаваў над праграмным дыптыхам “Брама”. Брама на графічных аркушах выступае пасрэднікам паміж светам жывых і мёртвых. Перад сімвалічнай будоўляй мы бачым белага каня, які заціснуў у зубах цуглі. Але яны не трымаюцца за аброць, таму конь можа аслабіць сківіцы, часткова папругі выпадзе — ён стане абсалютна вольным. Але жывёла гэтага не робіць, таму што гэтае абмежаванне патрэбна яму як аб’езджанаму каню, бо яго вольнасць асэнсаваная. Яго ўнутраная энергія і сіла ўтаймаваныя. Тут у некаторай ступені праводзяцца паралелі з чалавекам: ён сталее, адукоўваецца, знаходзіць сваё месца ў жыцці, асэнсоўвае сябе неабходнай часткай грамадства — і вось без гэтых цугляў ужо не ўспрымае сваё жыццё». У дыптыху Уладзімір Лукашык філасофствуе над мінулым, сучасным і будучым, абагульняе свой вопыт і выводзіць пасланне нашчадкам». Увогуле коні — асобная тэма ў творчасці У. Лукашыка на працягу ўсяго жыцця. Уражвае і работа з 1991—1992 гг. — «Зацугляны»…

У каталогу — і рэпрадукцыі малюнкаў да кнігі Васіля Гігевіча «Марсіянскае падарожжа». Пісьменнік Віктар Шніп, які часта сустракаўся з мастаком, занатаваў у адным са сваіх дзённікавых раманаў пра Уладзіміра Лукашыка: «…11.08.2017. А трэцяй працоўнага дня прыходзіў Уладзімір Лукашык. Прынёс з сабой работы сваіх студэнтаў, якія ў час практыкі зрабілі тры арыгінал-макеты кніжак. Адна студэнтка папрацавала над “Прыгодамі мышкі Пік-Пік” Людмілы Рублеўскай і на праглядзе атрымала дзясятку. І яшчэ адна дзяўчына атрымала дзясятку, а другая дзявятку, зрабіўшы арыгінал-макеты маёй кніжкі хоку “Кроплі з вечнасці”. Уладзімір абяцаў падумаць над афармленнем “Беларускай песні” Уладзіміра Караткевіча, якая плануецца да выхаду ў наступным годзе ў серыі “100 вершаў”. “Я ўжо не маладзён, таму калі буду рабіць нешта, то зраблю так, каб гэта засталося. Як узор мастацкасці. Халтурыць не буду!” — сказаў мой госць. Кніжныя праекты, якія ён у свой час распачаў з Мачульскім, Уладзімір збіраецца працягнуць і завяршыць. Ужо гадоў дзесяць працуе над афармленнем “Паноў Кубліцкага ды Заблоцкага” Пятра Васючэнкі. Мяркуе праз пару гадоў закончыць. Я хацеў сказаць сябру, што з такімі тэмпамі працы над афармленнем яму трэба жыць гадоў трыста, каб ажыццявіць усё, што задумаў. Не сказаў. Дасць Бог, і Валодзя зробіць усё, што хоча, і да ста гадоў…»



*Ілюстрацыя да кнігі Г. Далідовіча «Гаспадар-камень», 1987 г.*

Кароткае адступленне. Традыцыйны кніжны рынак, які расквітнеў напрыканцы XX стагоддзя, у апошнія дзесяцігоддзе істотна звузіўся. І гэта балюча ўдарыла па творчасці кніжных графікаў… Многія славутыя майстры ілюстравання кніг, асабліва кніг мастацкіх, дзіцячай літаратуры, альбо па меры магчымасцей пачалі працаваць для маскоўскіх, санкт-пецярбургскіх кніжных выдавецтваў, ды і для выдавецтваў не толькі Расіі, але і Вялікабрытаніі, краін Заходняй Еўропы, альбо ўвогуле спынілі свае памкненні, захапленне афармленнем кніг пасунулі на лепшае заўтра…



*Ілюстрацыя да кнігі П. Васючэнкі «Жылі-былі паны Кубліцкі ды Забалоцкі», 2003 г.*

Амаль не працавалі як кніжныя графікі ў апошнія гады свайго жыцця такія майстры, як Арлен Кашкурэвіч, Георгій Паплаўскі… Кнігавыдавецкая галіна ў сілу аб’ектыўных прычын не здолела стварыць адпаведныя ўмовы для развіцця кніжных графікаў, для належнай ацэнкі іх працы. Хаця разуменне, што без яркіх мастакоў няма руху наперад, кіравала і жаданнем захаваць пэўныя традыцыі ранейшых дзесяцігоддзяў. Размова — і пра конкурс «Мастацтва кнігі», і пра акцэнты ў афармленні дзіцячых кніг на жывую ілюстрацыю, на арыгінальныя аўтарскія адкрыцці. І ўсё ж, і ўсё ж… Несумненна, ва ўмовах 1980-х гадоў, ва ўмовах ранейшых дзесяцігоддзяў кнігавыдавецкай рэчаіснасці талент Уладзіміра Лукашыка як кніжнага графіка набыў бы іншае, болей узнёслае развіццё. Але час такі, які ён ёсць… І ва ўмовах гэтага часу Уладзімір Лукашык і як ілюстратар зрабіў даволі шмат. Перад вачыма — і вокладка да гістарычнага рамана Генрыха Далідовіча «Гаспадар-камень». Што ўжо казаць пра працу мастака над графічным прачытаннем рамана Леаніда Дайнекі «Меч князя Вячкі»!.. Раман, які расказвае пра падзеі XII стагоддзя, запатрабаваў ад ілюстратара, мастака кнігі паглыбленне ў адпаведны гістарычны адрэзак часу. Але, відавочна, поспеху ў афармленні паспрыяла ў значнай ступені іншае. Уладзімір Лукашык пачуў словы з прадмовы да кнігі «Слова на дарогу»: «…У кожнага народа павінна быць нацыянальная энергія і гістарычная памяць. У кожнага». І набіраўся гэтай энергіяй, насычаўся гэтай гістарычнай памяццю. Таму і выглядаюць продкі, гараджане старажытнага Полацка з рамана «Меч князя Вячкі» такімі блізкімі і роднымі…

Энергія мастака, яго гісторыка-нацыянальны пошук — і ў плакатах, «карцінах, на якіх чытаюцца словы». Трыпціх, створаны ў 2000 годзе («Будзеш есці хлеб», «Пакуль не вернешся ў зямлю», «З якой ты ўзяты» — папера, туш), — гэта і сімвалы, якія выяўляюць мастацкую пазіцыю мастака, адлюстроўваюць яго светабачанне, адносіны да жыцця і мастацтва. «Мы прыходзім у гэты свет гасцямі, і ад кожнага застаецца свой след. Хтосьці пакідае нам вялікую спадчыну, некаторыя ж дасягненні праяўляюцца праз гады і стагоддзі», — так пачынаецца ўступны артыкул да каталога.

Дасягненні Уладзіміра Лукашыка, след яго выразна акрэслены гэтым выданнем. Яно стане і напамінам пра неабходнасць стварэння альбома ці проста кнігі, прысвечанай творчасці сумленнага працаўніка на ніве кніжнай графікі, на ніве выяўленчага мастацтва Беларусі. Уладзімір Лукашык, несумненна, гэтага заслугоўвае. І гэта зразумела ўжо сёння…

**Раман СЭРВАЧ**



*Ілюстрацыі да кнігі Л. Дайнекі «Меч князя Вячкі», 1987 г.*

# Духоўныя каштоўнасці

**Святочную праграму «Вібрацыі часу», прымеркаваную да 85-годдзя заслужанага калектыву Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы Рэспублікі Беларусь імя Рыгора Шырмы, прадставілі ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі.**

На сцэне Вялікай залы з 85-годдзем калектыў віншавалі першы намеснік міністра культуры Дзмітрый Шляхцін (ён да таго ж зачытаў віншавальны ліст ад міністра культуры Руслана Чарнецкага), генеральны дырэктар Беларускай дзяржаўнай філармоніі Аляксандр Нікіта, яе мастацкі кіраўнік Юрый Гільдзюк ды іншыя. Добрыя словы гучалі ў адрас выканаўцаў і галоўнага дырыжора харавой капэлы імя Р. Шырмы Вольгі Янум.



Дзмітрый Шляхцін і Вольга Янум падчас урачыстасці.

— Святочны канцэрт склалі два дыяметральна супрацьлеглыя аддзяленні, — адзначае Вольга Яўгенаўна. — У першым узднімаюцца глыбокія філасофскія тэмы, закранаюцца пытанні аб сэнсе жыцця. Усе творы гэтай часткі канцэрта для мяне складваюцца ў малітву аб міры. І многія з іх не багаслужэбныя, аднак па сваё сутнасці глыбока духоўныя.

Такім зместам адрозніваецца, напрыклад, прэм'ера твора Алены Атрашкевіч, старшыні Беларускага саюза кампазітараў. Музыку яна напісала на словы Л. Воінавай.

— Калі ты ідзеш на канцэрт капэлы, разумееш: будзе якаснае, вельмі цёплае і добрае стаўленне да твораў. Заўсёды чакаю свайго прачытання ад калектыву, які ведае, як выконваць беларускую музыку, — упэўнена Алена Віктараўна. — Мая мініяцюра «У мігценні лампад» — з новага нотнага зборніка пад назвай «Белая царква», што ўключае ў сябе духоўныя творы, якія сёння павінны нас абагрэць, уразіць і правесці ў прыгожую будучыню. Калі з'явіўся гэты «Праваслаўны сшытак», я зразумела, што грамадства мае патрэбу ў своеасаблівым духоўным пажытку, шукае апірышча і ў нацыянальных асновах, этычных нормах, унутраных маральных прынцыпах. Нам абавязкова трэба шукаць і заўсёды ў нешта верыць… Калі я напісала гэты цыкл, то з вялікім задавальненнем даверыла яго Вользе Яўгенаўне, абсалютна не чакаючы, што адразу ўсё загучыць. Дырыжор выбрала тое, што адгукнулася ў яе ў сэрцы. Аднак папярэднічаў усяму твор на вершы беларускай паэтэсы Аліны Легастаевай «Страчаны рай», які паспяхова выконвацца ў Расіі на беларускай мове. Сапраўды, наша музыка цікавая не толькі ў Беларусі, але і за мяжой. Між тым каму, як не капэле, выконваць музыку айчынных кампазітараў? Вялікая ўдзячнасць калектыву і кіраўніку за захаванне традыцый і папулярызацыю беларускага мастацтва.

Яшчэ адна своеасаблівая прэм'ера для краіны — першае выкананне музыкі, напісанай 30 гадоў таму. Гаворка пра «*Der Psalm 150*» кампазітара і педагога, арганіста Алега Янчанкі, дарэчы, стваральніка Дзяржаўнага камернага аркестра.

— Гэта грандыёзны твор, які завяршае першае аддзяленне канцэрта, — працягвае Вольга Яўгенаўна. — Напісаны 150-ы псалом для ўнікальнага складу: пяць медных духавых інструментаў, дзве трубы, тры трамбоны, арган, падвойны хор і салісты. Ён, як і наогул уся першая частка праграмы, расказвае пра душэўныя пакуты чалавека, раскаянні, роздумы аб сэнсе і каштоўнасці кожнага жыцця…

Тым часам другое аддзяленне — даніна павагі, паклон стваральніку харавой капэлы Рыгору Шырму. Харавы дырыжор, кампазітар, педагог, грамадскі дзеяч, публіцыст, літаратуразнавец, Рыгор Раманавіч збіраў народную песню і зрабіў многае для таго, каб з'явілася «Анталогія беларускай народнай песні», дзе сабраны практычна ўсе самыя знакамітыя творы — прадстаўнікі жанру на той час. І дагэтуль прафесійныя кампазітары, і не толькі, яны чэрпаюць натхненне з гэтага цудоўнага зборніка.

Так, другую частку праграмы склалі руская народная песня «Казацкая» ў аранжыроўцы К. Мадатавай, два фрагменты з Сімфоніі № 2 для змешанага хору «Поры года» на народныя тэмы («Ярынная» і «Калядная») Алега Хадоскі, яшчэ адна прэм'ера вечара — «Да продкаў» Кацярыны Сянкевіч і, галоўнае, шэраг беларускіх народных песень як у традыцыйных харавых апрацоўках, зробленых сучаснікамі Рыгора Шырмы, так і ў арыгінальных інтэрпрэтацыях. Дапоўніла дзею харэаграфічная кампазіцыя Галіны Гарыновіч.

Кацярына Сянкевіч, новы твор якой прадставілі падчас канцэрта, падкрэслівае, што кампазіцыя «Да продкаў», прысвечаная 85-годдзю харавой капэлы, натхнёна Беларуссю і роднымі. Да яе стварэння падштурхнула якраз Вольга Янум.

— Усё напісалася за чатыры гадзіны, — дзеліцца малады кампазітар і выканаўца. — У творы аб'ядналіся тэатральнасць, розныя манеры спеваў, сучасныя інструменты — ударныя, званочкі Кошы. Яны сімвалізуюць неба, зямлю, агонь і ваду. Чатыры стыхіі здабываюць гучанне і напаўняюць прастору. Каб адлюстраваць канцэпцыю ўсяго канцэрта «Вібрацыі часу», я выбрала інструмент 2012 года пад назвай *RAV Vast*, які выйшаў майстар з Пермі. Інструмент, які дае своеасаблівае «касмічнае» гучанне, па сутнасці, адлюстроўвае час, які можна пачуць. Ён нібыта сімвал часу.

У якасці запрошанага госця на канцэртце выступіў Кірыл Жаровін (барытон), выпускнік Мінскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя М. Глінкі і саліст тэатра «Санкт-Петербургъ Опера». У яго выкананні гэтым вечарам прагучалі творы «Ікона» з цыкла «Песні ліхалецця» (на вершы Аляксандра Блока) і «Зару б'юць» з канцэрта для хору «Пушкінскі вянок» (на словы Аляксандра Пушкіна) Георгія Свірыдава.

— Мінск — гэта мой родны горад, таму вяртацца сюды заўсёды вельмі радасна. А калі ёсць нагода выканаць на беларускай сцэне вялікую несмяротную музыку — хвалююся і радуюся ўдвайне, — расказвае выканаўца. — У мяне шмат знаёмых і сяброў, якія займаюцца музыкай у Беларусі, таму ведаю, што адбываецца ў краіне ў гэтай сферы. Між іншым, родам адсюль, і гэта нядзіўна, — найлепшыя дзеячы сусветнай і расійскай сцэны. Музычнае мастацтва развіваецца, дарэчы, дзякуючы ў тым ліку Вользе Янум. Ведаю, што яна знаходзіць новыя творы, працуе з сучаснымі кампазітарамі, трымае высокі ўзровень эстэтычнай культуры.



Прафесійны рост — упор на якасць, а таксама неабыякавасць да таго, чым займаешся, адказнае стаўленне да працы — вось на што скіравана ўся ўвага Вольгі Янум, галоўнага дырыжора харавой капэлы імя Р. Шырмы. З гэтым наказам самім сабе музыканты і працягваюць сваё падарожжа, імкнучыся і надалей адчуваць змены часу.

**Яўгенія ШЫЦЬКА,**
**фота БелТА**

# Выбар ухвалены

**Днямі ў Малой зале імя Р. Шырмы Белдзяржфілармоніі сабраліся аматары скрыпічнай музыкі. Для іх лаўрэаты міжнародных конкурсаў скрыпачкі Марыя Пішчык і Кацярына Пукст, а таксама Тацццяна Кім (партыя фартэпіяна) падрыхтавалі праграму, якую склалі творы заходнееўрапейскіх і беларускіх кампазітараў. Гэтым вечарам адбылася і прэзентацыя новых майстравых скрыпак Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі — інструментаў работы Мікалая Стасава, майстра-рэстаўратара, заслужанага работніка культуры і члена Саюза скрыпічных майстроў Расіі.**

У першым аддзяленні, якое адрознівалася разнастайнасцю музычных фарбаў, прагучалі Саната, *op.* 3, № 5 Жана-Мары Леклера, французскага кампазітара і скрыпача, заснавальніка французскай скрыпічнай школы XVIII стагоддзя; саната «Развітальная» для дзвюх скрыпак і фартэпіяна Валерыя Карэтнікава (беларускага педагога і кампазітара не стала ў мінулым годзе); Лірычная сюіта, «Свіцязянскі ўспамін» і «Скерца» Уладзіміра Грушэўскага (творца, які працуе з аркестравай і вакальна-аркестравай музыкай, эксперыментуе ў камерна-інструментальных і камерна-вакальных жанрах, гэтым вечарам прысутнічаў у зале).

А вось другое аддзяленне склала Сюіта для дзвюх скрыпак і фартэпіяна ў чатырох частках («Заходнія танцы 1», «Элегія», «Заходнія танцы 2», «Тарантэла») Антэ Божыч-Кудрыча. Першы буйны твор сучаснага маладога кампазітара з Харватыі, напісаны ў 2014 годзе, прагучаў у Беларусі ўпершыню. Цікавы выбар, ці не так? А што вядома пра аўтара музыкі?



Выступаюць Марыя Пішчык і Кацярына Пукст.

Антэ Божыч-Кудрыч атрымаў пачатковую і сярэднюю музычную адукацыю ў музычнай школе «*Josip Hatze*» ў Спліце. Скончыў фартэпіянную адукацыю ў Акадэміі музыкі Заграбскага ўніверсітэта ў 2012 годзе. Лаўрэат шэрагу харвацкіх конкурсаў маладых піяністаў. Выступаў на шматлікіх канцэртах, працаваў акампаніятарам на фартэпіяна ў балетнай студыі і са спевакамі, у Нацыянальным тэатры ў Спліце (удзельнічаў у стварэнні опер і мюзіклаў), выкладчыкам фартэпіяна як у школе, так і прыватна. Таксама выступаў з аркестрам.

З 2014 года Антэ Божыч-Кудрыч актыўна займаецца творчасцю. Напісаў, напрыклад, музыку да анімацыйнага кароткаметражнага фільма «З глыбіні» (2014), а па просьбе галандскага фартэпіяннага дуэта Грыга стварыў сваю «Рапсодыю для фартэпіяннага дуэта» (прэм'ера — 2019 год). Тады ж склаў так званы «Альбом для маладых» з 72 п'ес рознай складанасці, прызначаных для юных піяністаў, а таксама для выканаўцаў сярэдняга і прасунутага ўзроўню…

Мінская публіка, безумоўна, засталася ў захапленні ад прапанаванага арганізатарамі твора, ад выдатнага выканання Марыяй Пішчык, Кацярынай Пукст і Тацццянай Кім бойкай, жыццесцвярджальнай і пачуццёвай музыкі Антэ Божыч-Кудрыча. Парадаваў і сюрпрыз — інтэрпрэтацыя «*Chariots of Fire*» грэчаскага кампазітара Вангеліса.

Наступны раз пачуць ігру згаданых скрыпачак можна падчас канцэрта «Бахіяна» (праграму да 340-годдзя Іагана Себасцьяна Баха прадставіць 27 сакавіка Струнны аркестр Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі імя М. Я. Фінберга). Тацццяна Кім выступіць 21 сакавіка разам з Дзмітрыем Цітовым (домра, дырыжор) на канцэрце домравай музыкі «XVII—XX» у рамках праекта «*Folk Strings*».

**Яўгенія ШЫЦЬКА,**
**фота аўтара**

# Партрэт на фоне эпохі

**Цяжка ацаніць глабальную з'яву, калі яна — звыклы фон твайго жыцця. Калі я была вучаніцай сярэдняй школы, іх песні ўвесь час гучалі па радыё і тэлебачанні і можна было папросту сустрэць артыстаў на вуліцах сталіцы.**

**Праектамі, прысвечанымі Уладзіміру Мулявіну і «Песнярам», Беларускі дзяржаўны інстытут праблем культуры, дзе я працавала ў рэдакцыйна-выдавецкай лабараторыі, займаўся ў 2005—2008 гг. Мне ўручылі стос публікацый аб легендарным ансамблі і яго кіраўніку з просьбай напісаць тэкст. Здзівіла, што ў артыкулах быў разнабой у датах нейкіх падзей. Адкінула ўсе звесткі пра пазасцэнічнае жыццё артыстаў, якімі шчодра дзяліліся з прэсай у гады перабудовы. Хацелася пакінуць галоўнае — тое, што стала і застанецца здабыткам гісторыі беларускай культуры.**



*Фота Кастуся Дробава.*

## Пачатак

Нарадзіўся ў Свярдлоўску ў студзені 1941 года, за паўгода да пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Часцінка вялікага народа, пакутніка і пераможцы, ён вучыцца жыць і думаць у маштабах велізарнай гераічнай краіны.

Інтэрв'ю з самім Мулявіным і яго сучаснікамі, якія ўспамінаюць пра гэтага чалавека, выхоплваюць розныя грані яго натуры. У 7 гадоў трапіў на рэпетыцыю і запісаўся ў струнны аркестр. Потым — ва ўсе аркестры недалёка ад дома. У шматлікіх інтэрв'ю Мулявін адзначаў, што яму пашанцавала: Аляксандр Іванавіч Наўроцкі — выдатны педагог, выхаванец Харкаўскага інстытута культуры, рэпрэсіраваны — займаўся з будучым песняром па 6—7 гадзін у суткі.

З ранніх гадоў Уладзіміру Мулявіну ўласцівая самастойнасць: зарабляць на хлеб пачаў у 11—12 гадоў, іграючы на самых розных інструментах на вуліцы, каля цягнікоў… У 1956-м паступіў у Свярдлоўскае музычнае вучылішча. У 15 гадоў спрабаваў стварыць джаз-бэнд. Дзевяць аднадумцаў адлічаны з вучылішча «за захапленне заходняй музыкай». Раз'ехаўшыся па родных гарадах, паступілі зноў… Уладзіміра Мулявіна неўзабаве аднавілі ў Свярдлоўскім музвучылішчы…

У 1959 годзе ён атрымаў запрашэнне ад Беларускай філармоніі і прыехаў у Мінск. Тут яшчэ няма джаза, але адкрыў для сябе фолк-рок.

Пра службу ў войску (1960—1962 гг.) пазней Мулявін казаў: «"Лявоны"-салдаты да гэтага часу аказваюць вялікі ўплыў на артыстаў-"Песняроў"… У замежных гастролях мы пачуваемся байцамі савецкага войска мастацтваў…» Звольніўшыся ў запас, Уладзімір Георгіевіч вярнуўся на працу ў Белдзяржфілармонію.

## Першая ступень да славы

Служба ў Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акрузе стала важнай вяхой у лёсе Уладзіміра Мулявіна: у 1960 годзе ён знаёміцца з Леанідам Тышко, Уладзіславам Місевічам і Уладзімірам Яшкіным. У той перыяд Мулявін адточвае майстэрства саліста і гітарыста, стварае першыя аранжыроўкі народных песень. Куміры 1960-х — вакальныя квартэты: вядома ж, «Бітлз», уплыву якога не пазбеглі нашы героі, грузінскі «Арэра», азербайджанскі «Гайна»…

Мулявіна і таварышаў аб'ядноўваюць цікавасць да беларускага песеннага фальклору, вялізная працавітасць і жаданне спасцігаць новае. З акампаніруючай групы танцавальнага ансамбля «Лявоніха» нараджаецца квартэт «Лявоны». У 1969-м у калектыў прыйшлі Валерый Мулявін (рытм-гітара) і Аляксандр Дзямешка (ударныя). У іх рэпертуары — і савецкая класіка, і заходнія хіты. Спалучыўшы гітарна-ўдарны склад з дудачкай, цымбаламі, лірай, скрыпкай, «Лявоны» падышлі да свайго чытання беларускага песеннага фальклору.

Першаму канцэрту папярэднічалі паўгода рэпетыцый — і поспех!

## Прачнуліся знакамітымі

На пытанне «За што вы палюбілі народную песню?» Уладзімір Мулявін у адным з інтэрв'ю адказаў: «За наіўнасць і адначасова за глыбіню тэксту. Там каласальная паэзія, а якая філасофія!»

Грунтоўным быў падыход гурта да свайго рэпертуару, старанна абдумвалася і назва — утульную «Лявоны» вырашылі змяніць на больш маштабную — «Песняры». Гэта шмат да чаго абавязвала, патрабавала сучаснага прачытання народнай песні і грамадзянскага гучання астатняга рэпертуару. У канцы 1969-га ў ансамбль прыходзіць Уладзімір Мікалаеў: у палітру «Песняроў» уплятаюцца арган і трамбон.

IV Усесаюзны конкурс артыстаў эстрады ў кастрычніку 1970-га ў Маскве адбыўся пасля 12-гадовага перапынку. «Песняры» прыехалі за ўласны кошт, на свой страх і рызыку (ні пра якую падтрымку не магло быць і гаворкі, вакальна-інструментальны жанр з вялікай цяжкасцю прабіваў шлях на эстраду), і прадставілі на суд патрабавальнага журы і слухачоў у першым туры песні «Трубачы», «Цёмная ноч», а таксама баладу «Хатынь», спецыяльна напісаную для іх Ігарам Лучанком. У другім туры «Песняры» раскрылі багаты дыяпазон беларускай лірычнай песні: «Ты мне вясною прыснілася» (Ю. Семянякі), «Ой, рана на Івана», *Ave Maria* (М. Танка). «На галаву вышэй за іншых», «калектыў, незвычайны ва ўсіх адносінах», «яны заваююць увесь свет» — прэса не скупілася на добрыя словы.

## Крыніца творчасці

З'яўленню шматлікіх песень у рэпертуары ансамбля папярэднічалі фальклорныя экспедыцыі, адкрыцці варыянтаў выканання адной і той жа песні ў розных рэгіёнах рэспублікі. Аранжыроўка выконвалася далікатна — «Песняры» імкнуліся захаваць і выявіць усю прыгажосць меладычнага малюнка. «Гэта не стылізацыя "пад народ" і не механічнае перанясенне песень на сёлетнюю эстраду. Цяжка вельмі, — прызнаваўся Уладзімір Георгіевіч, — але вынік акупляе ўсё шматкроць».

Уладзімір Мулявін элегантна і вельмі гарманічна спалучыў архаічныя пласты музыкі з сучаснымі, стварыўшы зусім новы напрамак у савецкай эстрадзе — неафальклярызм. У прэсе, тым не менш, спачатку разгарэліся дэбаты аб этычнасці «такога вольнага абыходжання з фальклорам», артыстаў нават абвінавацілі ў тым, што яны «каламуцяць празрыстую ваду народных песенных крыніц».

Іх задачай пры запісе другога альбома было вяртанне слухачам традыцыйнай каляндарна-абрадавай песні. Прытрымліваючыся народнага календара, творча перапрацоўваючы зыходны матэрыял, кампазітар-аранжыроўшчык і музыканты ствараюць яркія запамінальныя вобразы: гулкія покліч прыроды, якая прачынаецца, у вясновай песні «Жавароначкі, прылятайце», пастараль летняй купальскай песні з прадчуваннем чарадзейства, вясёлая святочнасць жніўных песень…

## Гастролі

У «Песняроў» шчаслівы гастрольны лёс: Германія, Польшча, Чэхаславакія, Румынія, Францыя…

У адным з інтэрв'ю Анатоль Кашапараў успамінаў: «Позняй восенню 1971-га паступіла прапанова ад Мулявіна працаваць у ансамблі. Згадзіўся і ўжо праз тры дні паехаў з калектывам у Чэхаславакію. Гэта была падзея нешараговая, паколькі дазволаў на падобныя паездкі ў той час даводзілася чакаць да паўгода».

У Канах у 1975-м іх пачуў амерыканскі імпрэсарыа Сід Гарыс, які пажадаў аб'яднаць у адным канцэрце амерыканскае (група *New Christy Minstrels*) і беларускае канты. Нягледзячы на афармленне дакументаў, узгадненні і іншую бюракратычную цяганіну, што заняло цэлы год, «Песняры» атрымалі візы ў Амерыку. 1976 год, першае заакіянскае турнэ, маленькія мястэчкі Поўдня заваяваны беларускай лірыкай. Фірма «Каламбія» запісала дыск, куды ўвайшлі «Купалінка», «Касіў Ясь канюшыну», «Вераніка»… Праз год — другая паездка ў Штаты. Гастралявалі ў гарадах Індыі і ў краінах Афрыкі.

Самым адказным момантам «Песняры» лічылі выступленне ў канферэнц-зале ААН, дзе прадстаўлялі культурную праграму, прысвечаную 100-годдзю Максіма Багдановіча. Гэты час нарадзіў дзве легенды: «Слухаць "Песняроў" завяшчаў вялікі Ленан» і «Пол Макартні зайздросціў "Песнярам"».

## У садружнасці

Героіка-патрыятычная тэма — другі краевугольны камень славы «Песняроў». У іх рэпертуары новае гучанне набывае «Цёмная ноч» М. Багаслоўскага, з іх лёгкай рукі сталі папулярныя «Дразды» У. Шаінскага… Своеасаблівай застаўкай канцэртаў стала «Беларусь» А. Пахмутавай на вершы М. Дабранравава, спадабалася слухачам і «Белавежская пушча».

Асобна варта згадаць у гэтым «зорным» шэрагу Ігара Лучанка. Супрацоўніцтва кампазітара і «Песняроў» падарыла слухачам 24 песні.

«Не трэба думаць, што ўсё ідзе гладка. Слухач бачыў толькі айсберг, а велізарная крыга "адпрацаванага" матэрыялу, дзясяткі варыянтаў, якія чамусьці не задавальнялі нас ці кампазітараў, спрэчкі, а часам і сваркі застаюцца за дзвярыма творчай лабараторыі. Песня не павінна, не можа прыстасоўвацца да ансамбля, ёй <…> неабходна быць выпакутаванай і ім, і кампазітарам», — гэтыя словы Уладзіміра Георгіевіча цалкам справядлівыя ў адносінах сумеснай творчасці з Ігарам Лучанком.

## Буйныя канцэртныя формы

Велізарны творчы патэнцыял ансамбля, артыстызм, уменне музычнымі сродкамі раскрываць разнапланавыя характары падштурхнулі «Песняроў» да работы над буйнымі канцэртнымі формамі.

Першай стала опера-прытча «Песня пра долю», у аснове якой ляжалі раннія творы народнага паэта Беларусі Янкі Купалы (лібрэта і пастаноўка Валерыя Яшкіна). «Песняры» разважалі пра лёс беларускага селяніна, асуджанага з маленства на беспрасветную галечу…

Паспрабаваўшы сілы, перайшлі да больш складанага твора — паэмы «Курган», спецыяльна для гэтай мэты пашырыўшы склад ансамбля.

Дыпломнай работай І. Лучанка была Кантата для сімфанічнага аркестра, хору і салістаў, напісаная па матывах паэмы Купалы. Створаны на музыку Лучанка ў аранжыроўцы Мулявіна спектакль ішоў з вялікім поспехам. Прэм'ера «Гусляра» адбылася ў 1979 годзе. З таго часу выступленні «Песняроў» праходзілі наступным чынам: адно аддзяленне — тэатралізаваная кампазіцыя, другое — песеннае.

Праграму «Праз усю вайну» рыхтавалі ў садружнасці з паэтам Валянцінам Тарасам. Звярнуліся да творчасці Янкі Купалы, А. Твардоўскага, А. Пракоф'ева, С. Гудзенкі, Н. Кісліка, Э. Агняцвет. У выніку жорсткага адбору ў новай кампазіцыі засталося 17 песень (напісана было значна больш). Прысвечаная 40-годдзю вызвалення Беларусі ад фашыстаў, праграма стварыла вобраз радавога героя вайны.

Між тым праграма «Вольнасць» была прысвечана тэме аб'яднання славянства (праваслаўных украінскага, рускага і беларускага народаў) і ўключала песні на трох мовах.

## Аб'ект даследавання

Пра такую з'яву, як «Песняры», нельга было не казаць — ансамблем заняліся не толькі журналісты, але і музыказнаўцы-аналітыкі. Старанна разбіраліся прыступкі да славы, усебакова разглядалася кожная праграма, яе плюсы і недахопы.

Прысвечаныя творчасці «Песняроў» аналітычныя матэрыялы адзначалі велізарную ролю калектыву ў тым, што на адной шостай частцы свету абудзілася цікавасць да беларускай песні. Адзначаючы яркую індывідуальнасць кожнага музыканта, не скупіліся на кампліменты Уладзіміру Мулявіну: яго спевы — адметная асаблівасць ансамбля, аранжыроўкі — узор высокага мастацтва. Любімай тэмай аналітычных работ былі традыцыі народнай песеннай культуры ў творчасці калектыву.

Аўтары гэтых работ аднадушныя ў высновах: ансамбль «Песняры» стаў адным з першых калектываў рэспублікі, які на аснове беларускай народнай песні пад уплывам сучасных плыняў — джаза і рока, а таксама савецкай песеннай класікі сфарміраваў нацыянальны песенны стыль, які арганічна ўліўся ў музычную культуру Беларусі.

**Вольга ПАЎЛЮЧЭНКА**

# У люстэрку свайго часу

**Споўнілася 120 гадоў з дня нараджэння Міхася Сеўрука, мастака, які нарадзіўся ў Варшаве, значную частку жыцця правёў у Вільні, а затым жыў і працаваў у Нясвіжы, дзе і знайшоў спачын. Жывапісца, графіка, гравёра лічаць класікам беларускага мастацтва, хоць, зразумела, імя яго гучыць з вуснаў не толькі беларусаў.**

Між тым жыццё і творчасць Міхася Сеўрука з'яданы найперш з беларускай зямлёй: нават вучыўся спачатку ў Нясвіжскай гімназіі. А ў 1927 годзе паступіў у Віленскі ўніверсітэт імя Стэфана Баторыя на факультэт прыгожых мастацтваў (тут даследчыкі заўсёды падкрэсліваюць: быў вучнем Фердынанда Рушчыца, Аляксандра Штурмана, Людаміра Сляндзінскага, знаходзяць прыкметы іх уплыву на творчасць жывапісца).



*«Аўтапартрэт».*

Пасля заканчэння ўніверсітэта ў 1932 годзе і да пачатку Другой сусветнай вайны Міхась Сеўрук жыў у Вільні, актыўна ўдзельнічаў у грамадскім і культурным жыцці горада — прадстаўляў свае работы на выстаўках, з'яўляўся адным з арганізатараў Віленскага таварыства мастакоў, у якое ўваходзілі, напрыклад, Пётр Сергіевіч і Язэп Драздовіч. Між тым браўся ледзь не за любую работу — грошай не хапала і тады, і пазней, таму і афармляў шыльды і вітрыны магазінаў, пісаў партрэты на заказ, а яшчэ, дарэчы, рабіў роспісы ў інтэр'ерах касцёлаў.

З 1939 года Міхась Канстанцінавіч жыў у Нясвіжы, дзе выкладаў маляванне і чарчэнне ў агульнаадукацыйнай школе і кіраваў мастацкай студыяй пры Доме культуры. Сёння многія творцы з удзячнасцю згадваюць свайго настаўніка. І былыя вучні, і ўсе тыя, хто цікавіцца творчай спадчынай мастака, не абмінаюць у Нясвіжы кватэру-музей Міхася Сеўрука, якая адкрылася ў 1996 годзе (дом № 38 па вуліцы Садовай).

Міхась Сеўрук стаў членам Саюза савецкіх мастакоў БССР з 1946 года. Шмат ствараў, у прыватнасці, працаваў над вокладкамі часопіса «Калосье», кнігі вершаў Максіма Танка «На этапах» і зборніка Рагора Шырмы «Наша песня». У розных калекцыях, у тым ліку прыватных, у Беларусі і за мяжой захоўваюцца яго работы. Вялікая колькасць — якраз у кватэрымузеі ў Нясвіжы.

Не стала мастака 14 сакавіка 1979 года. Пры жыцці Міхась Сеўрук так і не атрымаў шырокага прызнання — ніводнай персанальнай выстаўкі, ігнараванне савецкай уладай, бадай, таму, што не абраў сацрэалізм сваім творчым метадам. Жыў да таго ж даставткова далёка ад Мінска, культурнага цэнтра Савецкай Беларусі. Многія ўспамінаюць яго як сціплага чалавека. Прайшоў час — спадчына мастака стала нацыянальным здабыткам. Гэтаму паспрыялі і знакамітыя вучні Міхася Канстанцінавіча, якія дбалі аб тым, каб жывапісец і графік не быў забыты, каб створанае ім было ўпісана ў гісторыю айчыннага мастацтва. Дарэчы, Леў Гумілеўскі, адзін з выхаванцаў Міхася Сеўрука, разам са сваім сынам Сяргеем зрабіў барэльеф творцы, які ўсталявалі на яго магіле ў Нясвіжы.

Міхась Сеўрук быў неабыякавы да жанравай карціны і пейзажа. Мастацтвазнаўцы падкрэсліваюць: ранні работам уласцівы рамантызм, мастак імкнуўся ўславіць прыгажосць у розных яе праявах. Тым часам больш позвнія творы характарызуюцца дасканалым малюнкам, абагульненасцю вобразаў, скульптурнай аб'ёмнасцю форм. Аднак і тут не заўсёды абыходзілася без узвышанай прыгажосці. Часам можа здацца, што мастак набліжаўся да сацрэалізму, але гэта ілюзія — так званыя «праграмныя», у тым ліку позвнія работы, сярод якіх — «На ўборцы буракоў» (1936), «Жніво» (1937), «Новы дом» (1968), супярэчаць такому дапушчэнню. Сапраўды, Міхася Сеўрука больш за ўсё цікавіла жыццё простага чалавека, прадстаўніка свайго часу, свайго народа.

**Яўгенія ШЫЦЬКА**



*«Пад аркай у Нясвіжы», 1946 г.*



*«Інтэр'ер Віленскага ўніверсітэта», 1928 г.*



*«Луг», 1950-я гг.*

## зваротная сувязь

# Прыгожае пісьменства ў эфіры

Канал «Культура» Беларускага радыё запрашае слухаць літаратурнамастацкія і пазнавальныя перадачы.

У праекце Навума Гальпяровіча «Нам засталася спадчына» (ажыццяўляецца сумесна з Інстытутам літаратуры НАН Беларусі) ідзе размова пра гісторыю і культуру, велічных постацяў нашай мінуўшчыны і сучаснасці. Гэтым разам гаворка пойдзе пра ананімныя творы беларускай літаратуры XVIII—XIX стагоддзяў і паэму «Тарас на Парнасе».

У праграме «Прачулым радком» у суботу і нядзелю прагучаць вершы Рыгора Барадуліна.

У «Літаратурнай анталогіі» па буднях у выкананні Лікі Пташук ажывуць старонкі рамана Маргарэт Мітчэл «Знесеныя ветрам». У «Радыёбібліятэцы» з панядзелка да пятніцы слухайце твор Эрыха Марыі Рэмарка «Трыумфальная арка». Чытае Уладзімір Рагаўцоў.

Па суботах выходзіць перадача «Літаратурныя гісторыі», дзе гучаць апавяданні беларускіх і замежных аўтараў.

Юным прыхільнікам мастацкага вяшчання канал «Культура» прапануе з панядзелка да пятніцы ў межах праекта «Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя» чытанне кнігі Кацярыны Хадасевіч-Лісавой «Вухуцік і дзіва».

Штовечар у 21.00 для маленькіх «Вячэрняя казка».

Публіцыстычны суботні праект «Кнігарня» пазнаёміць з літаратурнымі падзеямі, навінкамі беларускіх выдавецтваў і зместам свежага нумара штотыднёвіка «ЛіМ».

## Мінскае гарадское аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі запрашае:

**28 лютага** — у Музей Якуба Коласа (вул. Акадэмічная, 5) на сустрэчу з Аленай Басікірскай і прэзентацыю яе кнігі «Быль пра школьніка Сёму». Пачатак у 13.00.

**28 лютага** — у «Кабінет пісьменніка» пры дзіцячай бібліятэцы № 2 (вул. К. Чорнага, 10) на творчую сустрэчу з Міхасём Пазняковым. Пачатак у 14.30.

**2 сакавіка** — у папраўчую ўстанову № 51 г. Мінска на творчую сустрэчу Тамары Кавальчук з асуджанымі. Пачатак у 15.00.

**3 сакавіка** — у «Кабінет пісьменніка» пры дзіцячай бібліятэцы № 2 (вул. К. Чорнага, 10) на творчую сустрэчу з Валянцінай Драбышэўскай. Пачатак у 12.30.

**3 сакавіка** — у дзіцячую бібліятэку № 16 (вул. Якубоўскага, 32) на пасяджэнне літаратурнай гасцёўні «Верасок». Госць — Сяргей Трахімёнак. Пачатак у 14.00.

**4 сакавіка** — на творчую сустрэчу Уладзіміра Мазго з вучнямі пачатковых класаў гімназіі № 56 (вул. Жукоўская, 6/4). Пачатак у 11.00.

**4 сакавіка** — у Дом дружбы (вул. Захарава, 28) на творчы вечар-прэзентацыю кнігі паэзіі Міхася Пазнякова «Полонез». Пачатак у 16.00.

**4 сакавіка** — на пасяджэнне літаратурнай гасцёўні «Аўтограф» (вул. Карбышава, 42). Пачатак у 17.00.

**5 сакавіка** — у Мінскі гарадскі Тэатр паэзіі пры Цэнтральнай бібліятэцы імя Я. Купалы (вул. В. Харужай, 16) на творчую імпрэзу паэта-песенніка Фёдара Баравога «Толькі пра каханне». Пачатак у 17.00.

**Выходзіць з 1932 года**

**Заснавальнікі:**
**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»**

**Галоўны рэдактар**
**Аляксей Іванавіч ЧАРОТА**

**Рэдакцыйная калегія:** Алесь Бадак, Дзяніс Барсукоў, Вольга Дадзіёмава, Алесь Марціновіч, Вячаслаў Нікіфараў, Мікалай Чаргінец, Іван Штэйнер

**Адрас рэдакцыі:**
**Юрыдычны адрас:**
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

**Адрас для карэспандэнцыі:**
220034, Мінск, вул. Захарава,19
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

**Тэлефоны:**
галоўны рэдактар — 325-85-25
адказны сакратар — 377-99-73
аддзелы крытыкі і бібліяграфіі;
прозы і паэзіі; мастацтва — 317-20-98
бухгалтэрыя — 311-17-16

Выходзіць раз на тыдзень у пятніцу.

**Падпісныя індэксы:**
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Выдавец:**
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар
Вольга Аляксандраўна АНУФРЫЕВА
Нумар падпісаны ў друк
27.02.2025 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 738

**Друкарня** Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 79/1. Індэкс 220013
Заказ — 287
Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе (праграма Microsoft Word), не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый.
Аўтары нясуць адказнасць за факты, якія прыводзяцца ў публікацыях, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

ISSN 0024-4686
9 770024 468001 25008